

ПРАВА НА СЯМ'Ю 5

ДОКТАР ПРА ЗДАРОЎЕ ПАДЛЕТКАЎ 8



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 112 (29226)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, пасол Беларусі ў Расіі:**

*«Мы сёння сапраўды знаходзімся на фінішы будаўніцтва атамнай станцыі. Павінен сказаць, што па энергаблоку нумар адзін мы літаральна праз тыдзень разам з кіраўніцтвам «Расатама» (а я да гэтага часу курырую гэтую станцыю, кожны месяц праводзім штабы) вызначымся з канкрэтнай датай фізічнага пуску».*

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў Прэзідэнту Украіны Уладзіміру Зяленскаму, а таксама яго жонцы беларускія вышыванкі.**
- Дэпутаты 11 чэрвеня разгледзяць у першым чытанні папраўкі ў закон аб дзяржрэгуляванні гандлю.
- **Беларускія вайскоўцы будуць удзельнічаць у парадзе Перамогі ў Маскве.**
- Купалаўскі тэатр аднаўляе паказы з 15 чэрвеня.



- **ЕС і ПРААН у партнёрстве з Мінэканомікі Беларусі запусцілі анлайн-праграму «Школа стартапаў».**
- Будаўніцтва нафтаправода Гомель—Горкі будзе каштаваць каля Br300 млн і пачнецца 1 лістапада.
- **Айчынныя лясгасы адправілі другі кантэйнерны цягнік з пілаватарыяламі ў Кітай.**
- У Беларусі спросцяць атрыманне замежнай бязвыплатнай дапамогі.
- **Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 13 чэрвеня прамыя тэлефонныя лініі.**

# ПРАДЧУВАННЕ ПАЛЁТУ




**Мінскай сярэдняй школе № 73 з паглыбленым вывучэннем нямецкай мовы сёлета спаўняецца шэсцьдзясят гадоў, а гэта значыць, што сёлетні выпускны клас школы — пяцьдзясят дзявяты. Учора дваццаць дзевяць яе ўжо былых вучняў атрымалі атэстаты сталасці. Па даўняй традыцыі героі свята — юнакі і дзяўчаты пасадзілі маладзенькую тую на прышкольнай тэрыторыі. І, магчыма, заснавалі традыцыю новую — на развітанне з роднай школай выпусцілі ў неба белых галубоў.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

На кантролі

## Хто ў лес, а хто па дровы...

### Камітэт дзяржкантролю Віцебскай вобласці пацікавіўся, ці па-гаспадарску выкарыстоўваюць і аднаўляюць лес

**Як высветлілася, лес своечасова і якасна не аднаўляецца. А ў лесагаспадарчых арганізацыях няма сістэмнага падыходу, каб прадухіліць парушэнні заканадаўства. Яны ніяк не могуць выпрацаваць алгарытм, каб выпраўляць недахопы і пазбягаць іх. Да такіх вывадаў прыйшлі «рэвізоры».**

### Дар нябёс

Дарэчы, адпаведнае, можна сказаць, даследаванне тэмы вялося некалькі гадоў і працягваецца дагэтуль. Пытанне рацыянальнага выкарыстання лесу было і застаецца на кантролі кіраўніцтва краіны, тым больш што ў красавіку Прэзідэнту ўнеслі на разгляд праект указа «Аб вядзенні лясной гаспадаркі і рэалізацыі драўніны». Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што лес — наша багацце, у тым ліку і як «прыродны лекар» — для здароўя беларусаў. І нездарма, улічваючы і вялікую колькасць балот, сярод якіх ёсць унікальныя, тэрыторыя Беларусі лічыцца лёгкімі еўрапейскага кантынента. Але да гэтага багацця трэба ставіцца беражліва.

СТАР. 2

Жыццё не спыняецца

## ПЕР ГЮНТ. ТАНЕЦ ПРА ПОШУК СЯБЕ

### У Вялікім тэатры Беларусі рыхтуюць восеньскія прэм'еры

**«Балетнае лета», «Вечары ў палацы Радзівілаў» — улюбёныя публікай праекты Вялікага тэатра ў сезоне-2020, на жаль, з-за пандэміі не адбудуцца. Заўчасна скончыўся і ўвесь тэатральны сезон — практычна ўсе пастаноўкі перанесеныя на пазнейшы тэрмін. І тым не менш тэатр, які нядаўна адзначыў 87-годдзе, не сышоў на вымушаныя канікулы, а працягвае работу. З асаблівым натхненнем і хваляваннем тут рыхтуюць новую аўтарскую рэдакцыю «Шкаўкунка» ад славутага балетмайстра Валянціна Елізар'ева, дэбютную рэжысёрскую работу Аксаны Волкавай — оперу «Вілісы. Фатум» і, канешне, першую прэм'еру, якой 8 і 9 верасня адкрыецца новы, 88-ы сезон, — балет «Пер Гюнт» у пастаноўцы маладога харэографа Сяргея Мікеля.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «МЫ НІКОМУ НЕ ПАВІННЫ ДАЗВОЛІЦЬ ПАКРЫЎДЗІЦЬ ПРОСТАГА ЧАЛАВЕКА»

**У Палацы Незалежнасці адбылася нарада па актуальных грамадска-палітычных пытаннях. Прэзідэнт удзяліў увагу і сітуацыі, якая складваецца вакол Цэнтральнай выбарчай камісіі.**

Прысутным на сустрэчы кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Ігару Сергеенку, старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай і кіраўніку спраў Прэзідэнта Віктару Шэйману Аляксандр Лукашэнка даручыў выпрацаваць сістэму праверак прыватных кампаній, каб высветліць прычыны звальнення людзей у апошнія месяцы. Некаторыя з іх могуць быць звязаны з выбарчай кампаніяй.

«Што мяне абурае асабліва ў Мінску, іншых гарадах (гэта характэрна для гарадоў) — прыватныя кампаніі звальняюць людзей. Прытым баюся сказаць — масава, але досыць шмат. Я наконт гэтага адпаведную заяву ўжо рабіў. Мала таго, звальняюць людзей — тых, хто не аддаў подпіс за альтэрнатыўных так званых кандыдатаў, — перадае словы кіраўніка краіны яго прэс-служба. — ***Публічна хачу сказаць: калі яны хочуць у Беларусі прыстойна працаваць і даваць карысць краіне, не крыўдзячы людзей, яны павінны аднавіць гэтых людзей або аплаціць ім за тры, два ці адзін месяц — за тое, што выкінулі беспадстаўна»***.

Возьмуць удзел у праверцы нядобрасумленных прадпрымальнікаў генеральная пракуратура, Камітэт дзяржкантролю, мясцовыя органы ўлады.

«Трэба гэтых буржуяў прывесці ў прытомнасць. ***Мы нікому не павінны дазволіць пакрыўдзіць простага чалавека***. І справа не ў тым, што яны калісьці мяне прывялі да ўлады, а справа ў тым, што ў нашай краіне гэтага быць не павінна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Традыцыйна ў выбарчы перыяд Прэзідэнт сустракаецца са старшынёй Цэнтрвыбаркама для абмеркавання існуючых праблем і аказання дапамогі ў арганізацыі кампаніі.

«Я ўсё бачу. Галоўнае, вы не хвалюйцеся. У патрэбны час у патрэбным месцы мы прывядзём усіх у прытомнасць. ***Перавароту ў краіне не будзе. Майдана — тым больш»***, — звярнуўся Прэзідэнт да старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай.

На пастаяннай аснове ў ЦВК працуе некалькі чалавек, і зразумела, што самастойна ім арганізаваць такі складаны працэс, як выбары, нерэальна.

«Ясна, што два адказныя работнікі выбары ніяк не арганізуюць, асабліва з тэхнічнага пункту гледжання. Таму Адміністрацыя Прэзідэнта і Кіраўніцтва справамі заўсёды аказвалі неабходную падтрымку, якую ЦВК запытае. Прытым рабіць гэта трэба акуратна, каб ні нас, ні Лідзію Міхайлаўну (Ярмошыну, старшыню ЦВК. — **«Зв».**) не папракалі, што яна выкарыстоўвае нейкі адміністрацыйны рэсурс і рэсурс Прэзідэнта (таксама магчымага кандыдата ў прэзідэнты). Усё, што ЦВК папросіць, — мы павінны аказаць гэтую падтрымку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

# Хто ў лес, а хто па дровы...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На жаль, не вельмі мы шануем прыроду ў цэлым, і лес у прыватнасці. А Віцебская вобласць у сэнсе дароў неба — асаблівая. Гэта не толькі азёрны край, але і край лясоў. Поўнач краіны — адзін з маляўнічых куткоў Еўропы. Па прыгажосці, унікальнасці фаўны і флоры, па багацці запаведных месцаў цяжка знайсці падобныя мясціны. Уявіце: хвойныя пароды займаюць 60 % усёй лясной тэрыторыі. Найбольш высокая лясістасць у Расонскім, Полацкім, Лепельскім, Докшыцкім, Гарадоцкім раёнах.

Большасць лясоў (каля 88 %) на балансе Віцебскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання. У яго складзе на правах юрыдычных асоб знаходзіцца 19 дзяржаўных лясгасаў.



Фота БелТА.

## Нуль пераўтвараецца ў...

Маніторынг праводзіўся некалькі гадоў. За гэты час устанавілі і такія факты, калі лес высаджваўся толькі на паперы. Як і тое, што спрабавалі ў справаздачах павялічыць колькасць каштоўнай драўніны, каб атрымаць прэміі.

Зафіксаваны прыклады, калі драўніна літаральна валялася доўгі час і, пакуль шукалі пакупніка, стала няякасная...

— Але і цяпер выяўляюцца факты прыпісак аб'ёму выкананых работ па высечках, неабгрунтаванага ўводу маладняку ў катэгорыю каштоўных драўняных насаджэнняў, незаконнага атрымання бюджэтных сродкаў, — падкрэсліў **намеснік начальніка ўпраўлення кантролю за работай аграпрамысловага і прыродаахоўнага комплексаў Дзмітрый ДАВЫДЗЕНКА.**

Кантралёры, дарэчы, здзіўляліся таму, што тыя кіраўнікі лясгасаў, якія былі праверaны, не аддавалі неабходных загадаў і праз параўнальна нядоўгі час рабілі ж тыя самыя памылкі. Напэўна, думалі, што снарад двойчы ў адну варонку не трапляе?

**Старшыня Камітэта дзяржкантролю вобласці Уладзімір ГАДЗЯЦКІ** падкрэсліў, што ведамства ў першую чаргу зацікаўлена ў тым, каб у лясгасах быў парадак, ды і наогул у арганізацыях, якія правяраліся. І канешне, парушэнні трэба выпраўляць.

Што датычыцца перспектыў эфектыўнай работы — устаноўлены, напрыклад, выпадак, калі не асабліва спяшаліся з вырабамі гатовай прадукцыі. У Пастаўскім лясгасе і абласным «лясным» аб'яднанні не прымаюцца меры па своечасовым выкананні праектных і будаўнічых работ, якія датычацца пелетнага завода. Працэс на самацёку, канстатуюць кантралёры. А прадпрыемства маглі б адкрыць ужо сёлета. Адпаведна — ствараць рабочыя месцы, плаціць падаткі, экспартаваць прадукцыю. Па існуючай інфармацыі, пад пагрозай увод завода ў эксплуатацыю і ў 2021 годзе. У Камітэце дзяржкантролю нагадалі, што ініцыятарам стварэння такіх вытворчасцяў быў асабіста кіраўнік дзяржавы.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** на адным з пасяджэнняў расказаў пра інвестараў з Прыбалтыкі, якія збіраліся займацца ў нас апрацоўкай драўніны. Прывёў лічбы прадукцыйнасці, эфектыўнасці, канкурэнтаздольнасці, якія ўражваюць. Чаму мы не можам хоць напалову працаваць па такіх паказчыках, як тыя бізнесмены? Каб не адпраўляць за мяжу паўфабрыкаты, а вырабляць запатрабаваны на рынку прадукт з высокай дабаўленай вартасцю, і, зноў жа, у выніку плаціць параўнальна высокія падаткі, заробкі работнікам, дапамагаць у развіцці сельскіх тэрыторый? Пытанне застаецца адкрытым.

## Вакантныя пасады ёсць

Здзіўляе, што лясная галіна пакуль што ў стане кадравага голаду — ад леснікоў да кіраўнікоў. І гэта пры тым, што ў вобласці рыхтуюць профільных спецыялістаў. Напрыклад, у полацкім каледжы.

**Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс ЯФРЭМАЎ**, калі пытанне было агучана на калегіі Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці, выказаў шчырае здзіўленне, што ў арганізацыях, якія маюць непасрэднае дачыненне да лесу, не хапае работнікаў. А ўмовы працы прывабныя: свежае паветра, механізаванасць добрая, стабільныя заробкі. Толькі працуй! І пабачаў асабіста пракантраляваць пытанне з наборам людзей на работу...

Усяго па выніках кантрольных мерапрыемстваў, якія праводзіліся пачынаючы з 2018 года, былі выяўлены нямэтавае выкарыстанне сродкаў, незаконнае іх атрыманне і атрыманне з парушэннямі на суму 250,4 тысячы рублёў. Памер жа прычынення шкоды дзяржаве перавысіў 208,9 тысячы рублёў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты тры юрыдычныя асобы на суму 11,5 тысячы рублёў.

Да дысцыплінарнай адказнасці — 67 службовых асоб. Распачата 13 крымінальных спраў.

«Лясное пытанне» на кантролі, запэўнілі ў ведамстве.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «РАБІЦЬ ДАБРО — НАТУРАЛЬНА І НЕАБХОДНА»

**Міністэрства аховы здароўя падзякавала больш чым чатыром сотням кампаній і прадпрыемстваў, якія дапамагалі медыкам у апошнія месяцы і працягваюць гэта рабіць.**

— Нераўнадушныя грамадзяне нашай краіны, прадпрыемствы, камерцыйныя кампаніі, грамадскія арганізацыі, валанцёрскі рух — сваёй дапамогай, сілай духа і дабрынёй вы дапамагаеце не толькі медыкам, але і ўсёй краіне, якой неабходна падтрымка ў гэтых надзвычайных абставінах, — звярнуліся да ахвяравальнікаў у міністэрстве.

Там падкрэслілі, што ўсе пералічаныя на рахунак Міністэрства аховы здароўя сродкі гарантавана патрачаны на закупку абсталявання для лабараторнай дыягностыкі COVID-19, дыягнастычных набораў, ахоўных сродкаў, лекавых прэпаратаў, а таксама на аказанне дапамогі хворым.

— Матывы да дабрачыннасці могуць быць розныя, але адзіным застаецца перакананне, што рабіць дабро — натуральна і неабходна. Дзякуй вам за спагадлівасць і здольнасць суперажываць, уменне і жаданне падтрымаць тых, хто мае ў гэтым патрэбу, — адзначылі ў міністэрстве.

Пералік тых, каму ўдзячныя медыкі, складаецца з больш чым чатырох соцень прадпрыемстваў, кампаній і грамадскіх арганізацый.

**Алена КРАВЕЦ.**

**По звестках на 10 чэрвеня ў Беларусі выяўлена 51 066 выпадкаў COVID-19. Папраўіліся і выпісаны 25 667 чалавек, якія раней мелі станоўчыя тэсты, за перыяд распаўсюджвання інфекцыі памерла 288 пацыентаў. Праведзена 659 565 тэстаў. За апошнія суткі прырост склаў 801 новы выпадак, 1161 чалавек выпісана, шасцярых выратаваць не ўдалося. Дарэчы, колькасць пацыентаў, якія папраўіліся за апошнія суткі, найбольшая з пачатку распаўсюджвання хваробы. А з 30 мая колькасць новых інфіцыраваных ні разу не перавысіла 900 выпадкаў.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Сусветны банк спрагназаваў найбуйнейшы спад глабальнай эканомікі



Сусветная эканоміка з-за пандэміі каранавіруса сёлета скароціцца на 5,2 працэнта. Гэта стане найбуйнейшым яе тармажэннем з часоў Другой сусветнай вайны. Такі прагноз прыводзіцца ў дакладзе «Перспектывы сусветнай эканомікі» Сусветнага банка (СБ), піша РБК. «Крызіс, верагодна, пакіне доўгатэрміновыя шнары і створыць сур'ёзныя глабальныя праблемы», — заявіла віцэ-прэзідэнт СБ Джэйла Пазарбашыоглу. Пры гэтым найбольшае скарачэнне адчуюць развітыя эканомікі, чый аб'ём упадзе на 7 %. ВУП краін, якія развіваюцца, скароціцца на 2,5 %, і што стане першай «усёабдымнай рэцэсіяй у гэтай групе краін як мінімум за 60 гадоў», — адзначаецца ў дакладзе банка. Даходы на душу насельніцтва, чакаюць эксперты, знізяцца сёлета на 3,6 % — «і гэта прывядзе мільёны людзей у крайнюю беднасць». Раней Еўракамісія прызнала, што жорсткія меры, якія прынялі дзяржавы ЕС для барацьбы з COVID-19, прывялі да рэцэсіі, глыбейшай за якую ў Еўропе не было з часоў Вялікай дэпрэсіі.

## Улады ЗША маюць намер арыштаваць арганізатараў беспарадкаў

Адпаведныя дзеянні датычацца шэрагу асоб па абвінавачванні ў арганізацыі беспарадкаў падчас масавых пратэстаў, якія праходзілі ў апошнія тыдні ў краіне. Пра гэта заявіў міністр юстыцыі, генеральны пракурор ЗША Уільям Бар у інтэрв'ю журналістам тэлеканала Fox News. «Было такое, што ультраправыя групоўкі спрабавалі выдаць сябе за ультралевыя. Ультралевыя прыкідваліся ультраправымі. Прадстаўнікі абодвух бакоў спрабавалі распаліць гвалт», — заўважыў Уільям Бар. Кіраўнік Мінюста ЗША адказаў сцвярджальна на пытанне аб тым, ці плануецца ўзяць пад варту асоб, якія выступалі ў ролі арганізатараў. «Я не магу ўсталёўваць тэрміны ў тым, што датычыцца будучых расследаванняў. Аднак, думаю, мы ў поўнай меры нацэлены ўтаймаваць гэтыя групы», — дадаў ён. Раней Бар паведаміў, што ўлады ЗША праводзяць расследаванне ў дачыненні да шэрагу ўдзельнікаў пратэстаў у краіне, звязаных з рухам амерыканскіх антыфашыстаў «Антыфа». Ён удакладніў, што гэтыя людзі былі затрыманы падчас пратэстаў па абвінавачванні ў шэрагу злачынстваў.

## Некалькі гарадоў у Эквадоры пакрыліся вулканічным попелам

Жыхары некалькіх гарадоў Эквадора з раніцы выявілі, што ўсе вуліцы пакрытыя попелам. Яго ноччу выкінуў дзеючы вулкан Сангай, які знаходзіцца ў правінцыі Моран-Сант'яга, што на ўсходнім схіле Андаў. Попел дасягнуў правінцый Чымбараса (цэнтральныя Анды), Гуаяс (узбярэжжа Ціхага акіяна) і Лос-Рыас (на захадзе). У адным з найбольш населеных гарадоў Эквадора — Гуаякілі, што знаходзіцца амаль за 180 кіламетраў ад вулкана, — попел пакрыў амаль усе раёны. У Нацыянальнай службе кіравання рызыкамі і надзвычайнымі сітуацыямі (SNGRE) заклікалі насельніцтва прыняць меры засцярогі, неабходныя, каб абараніць сябе ад попелу, у тым ліку прыкрыць рот і нос маскамі. Вулкан Сінгай вышынёй 5230 метраў над узроўнем мора прачнуўся ў маі мінулага года. Ён з'яўляецца адным з найбольш актыўных у краіне, пастаянныя вывяржэнні адбываюцца з 1628-га.

Блізкая ўлада

# ЗАРОБАК І ЖЫЛЛЁ

**Да традыцыйных пытанняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі і будаўніцтва жылля, якія звычайна агучваюць мінчане падчас прамых тэлефонных ліній і прыёмаў грамадзян, сталі дадавацца тыя, што звязаны з работай эканомікі падчас пандэміі. Пра гэта паведаміў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінску Віталь ПРЫМА падчас прамой лініі, якую ён правёў у Партызанскім раёне сталіцы.**

— Традыцыйна на ўсіх прыёмах грамадзян і падчас правядзення прамых тэлефонных ліній заўсёды гучаць пытанні, звязаныя з работай ЖКГ, заўсёды хвалююць мінчан тэмы будаўніцтва і жылля. Падчас цяперашняй тэлефоннай лініі з'явіліся пытанні, звязаныя з сітуацыяй на рынку працы ва ўмовах пандэміі, — заўважыў памочнік Прэзідэнта.

У прыватнасці, да Віталя Прымы звярнулася дырэктар Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Яна агучыла праблему, з якой сутыкнуліся акцёры, што жывуць у арэндным жыллі: у цяперашніх умовах пандэміі заробкі паменшыліся амаль удвая, таму стала складана аплачваць суму арэнды кватэр. Дырэктар папрасіла паменшыць яе кошт на перыяд пандэміі.

— Па гэтым пытанні ў першую чаргу неабходна падымаць дзеючае заканадаўства. У межах яго прапрацуем, як мы можам пайсці насустрач тым, хто звяртаецца. Калі дзеючы закон не дазваляе аднамомантна вырашыць пытанне праз зніжэнне арэнднай платы, тады будзем яго разглядаць сумесна з камітэтам па культуры з мэтай павышэння даходаў такой катэгорыі грамадзян, — растлумачыў памочнік Прэзідэнта.

Акрамя таго, падымаліся пытанні своечасовай выплаты заробку, добраўпарадкавання тэрыторый, звышнарматыўнага тэрміну будаўніцтва жылля, рэалізацыі маёмасных правоў пры зносе жылфонду і іншыя. Таксама дазваніліся да інспектара па Мінску і жыхары іншых рэгіёнаў. Напрыклад, ліквідатар наступстваў аварыі на ЧАЭС з Гомеля прасіў пасадзейнічаць у вырашэнні жыллёвага пытання: мужчына 25 гадоў жыве ў інтэрнаце і 15 з іх стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў.

— Некаторыя пытанні, з якімі звярнуліся ўпершыню ці якія не разглядаліся на ўзроўні мясцовых улад, я, натуральна, перанакірую сваім калегам. А ў тых выпадках, калі заяўнікі прайшлі ўсе этапы разгляду ў сваім рэгіёне і не атрымалі вычарпальнага адказу, напэўна, будзем разглядаць на рэспубліканскім узроўні, — агучыў сваю пазіцыю Віталь Прыма.

Усе звароты пастаўлены на кантроль. Службам горада дадзены адпаведныя даручэнні, каб у кожнай сітуацыі былі прынятыя неабходныя меры для вырашэння пытанняў грамадзян.

**Паводле БелТА.**

Будзь у курсе!

# Білет на цягнік — па нумары мабільнага

**Уведзены новы спосаб афармлення электронных білетаў на цягнікі з ненумараванымі месцамі — гарадскіх ліній і рэгіянальных ліній эканомкласа. Пра гэта інфармуе прэс-цэнтр Беларускай чыгункі.**

Раней пры праездзе па электронным білеце патрабавалася прад'яўляць дакумент, які сведчыць асобу. Цяпер аформіць электронны білет на цягнікі гарадскіх ліній і рэгіянальных ліній эканомкласа на сайце pass.rw.by і ў мабільнай праграме «БЧ. Мой цягнік» можна з указаннем нумара мабільнага тэлефона пасажыра. Новая функцыя даступная для абанентаў усіх беларускіх мабільных аператараў.

Пры кантролі электронных білетаў пасажыр прад'яўляе бланк электроннага білета на экране мабільнай прылады або на папяровым носьбіце і адказ на USSD-запыт *147# з пацвярджэннем нумара тэлефона.

Новая функцыя ўведзена ў дадатак да дзеючага спосабу афармлення электронных білетаў (па дакуменце, які пацвярджае асобу).

З улікам бягучай эпідэміялагічнай сітуацыі Беларуская чыгунка рэкамендуе пасажырам карыстацца дыстанцыйнымі каналамі продажаў. Гэта хутка, проста і бяспечна.

За пяць месяцаў года праз адзіны раздзел «Паслугі пасажырам» pass.rw.by і мабільную праграму «БЧ. Мой цягнік» на цягнікі з ненумараванымі месцамі купілі 152,3 тысячы электронных білетаў.

Афіцыйная мабільная праграма Беларускай чыгункі «БЧ. Мой цягнік» даступная для бясплатнай запампоўкі на смартфоны і планшэты на платформах Android і iOS, нагадалі ў прэс-цэнтры магістралі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Прыёмная кампанія — 2020

# ЦТ: ЭКЗАМЕНАТАРЫ — У МАСКАХ, АБІТУРЫЕНТЫ — ПА ЖАДАННІ

**Тэрмін выдачы пропускаў на ЦТ абітурыентам, якія ў вызначаныя тэрміны запоўнілі электронную анкету і аплацілі рэгістрацыйны ўзнос за ўдзел у ЦТ, але не змаглі іх забраць з прычыны хваробы або вымушанай самаізаляцыі, падоўжаны да 25 чэрвеня. Пра гэта на сустрэчы з журналістамі паведаміла намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Наталля ВАЙЦЯХОВІЧ.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Таксама замест абітурыента пропуск можа атрымаць яго прадстаўнік пры наяўнасці дакумента, які пацвярджае ўважлівую прычыну, па якой сам абітурыент не змог гэта зрабіць. Натарыяльна завераная даверанасць для гэтага не патрабуецца.

Пры правядзенні ЦТ будуць выконвацца ўсе неабходныя санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні.

«Мы дакладна ведаем, што ЦТ — гэта экзамен з высокімі стаўкамі. Таму заўсёды асаблівая ўвага ўдзялялася падбору аўдыторыі, для таго каб абітурыентам было камфортна працаваць над тэстам. Летась патрабаванні сталі больш жорсткія, — падкрэсліла Наталля Вайцяховіч. — Яны датычацца ў першую чаргу рассаджвання абітурыентаў — з захаваннем дыстанцыі не менш за адзін метр. Гэта, вядома, прымусіла задзейнічаць досыць вялікую колькасць дадатковых аўдыторый. Акрамя таго, у кожным памяшканні павінна быць праведзена старанная прыбіранне з выкарыстаннем дэзынфектантаў. Абавязковая таксама наяўнасць антысептыкаў: каля ўваходу ў пункт тэсціравання, каля ўваходу ў экзаменацыйную аўдыторыю і непасрэдна ў аўдыторыі.

Арганізатары ЦТ будуць працаваць у масках і пальчатках. «Мы вітаем, калі і абітурыенты будуць таксама выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай абароны. Калі з нейкай прычыны абітурыент забыўся пра іх, але жадае імі скарыстацца, у кожным пункце будзе створаны рэзерв», — адзначыла намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.

Наталля Вайцяховіч звярнула ўвагу на тое, што, як і ў ранейшыя гады, прапускны рэжым абітурыентаў у пункт правядзення тэсціравання будзе ажыццяўляцца па дакументах, якія сведчаць асобу: размова ідзе пра пашпарт, пасведчанне на права жыхарства ці пасведчанне бежанца. «Варта заўважыць, што кожны год некаторыя абітурыенты спрабуюць трапіць на экзамен, выкарыстоўваючы пасведчанне кіроўцы ці іншыя дакументы. Яшчэ раз паўтару: усе астатнія дакументы, акрамя трох пералічаных, не з'яўляюцца дакументамі, па якіх можна трапіць на ЦТ», — дадала яна.

Некалькі апошніх гадоў абітурыентам даецца права здаваць чатыры экзамены ў форме ЦТ. Пры гэтым у прыёмную камісію па-ранейшаму падаюцца тры сертыфікаты. Сёлета кожны трэці абітурыент абраў у якасці ўступных выпрабаванняў чатыры навучальныя прадметы. Самая вялікая колькасць абітурыентаў пажадала здаваць рускую мову (на яе зарэгістравалася больш за 52 тысячы чалавек), матэматыку (звыш 34 тысяч), а таксама замежныя мовы. Лідарам сярод замежных моў з'яўляецца англійская, на якую зарэгістравалася 23 549 абітурыентаў.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе ў краіне 25 чэрвеня. Наталля Вайцяховіч звярнула ўвагу на тую акалічнасць, што пад тэсціраванне па рускай мове і матэматыцы сёлета адводзіцца два дні. Усе абітурыенты былі падзелены на два патокі. У частцы абітурыентаў дата праходжання ЦТ указана ў пропуску згодна з ранейшым графікам. А ў другой часткі прэтэндэнтаў на студэнцкі білет, якія афармлялі пропускі ўжо пасля зацвярджэння новага графіка, указана новая дата. На сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў можна знайсці табліцу адпаведнасці дат правядзення ЦТ, указаных у пропусках абітурыентаў, і новых дат правядзення цэнтралізаванага тэсціравання. І калі ў пропуску ўказана дата 15 чэрвеня, значыць, здаваць рускую мову трэба 26 чэрвеня. Калі ж абітурыент прыйдзе ў пункт тэсціравання 27 чэрвеня, ён не зможа здаць гэты прадмет. Самастойная замена дат недапушчальная.

**Сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання ў пунктах яго правядзення абітурыентам пачнуць выдаваць з 24 ліпеня, а тым, хто здаваў ЦТ у рэзервовыя дні, — з 29 ліпеня.**

Таксама Наталля Вайцяховіч назвала ўважлівыя прычыны для праходжання ЦТ у рэзервовыя дні.

«Ёсць так званы адкрыты пералік прычын, якія з'яўляюцца падставай для допуску абітурыента да здачы ЦТ у рэзервовыя дні. Лістом Міністэрства адукацыі гэтыя прычыны канкрэтызаваны. У пералік уважлівых нароўні з хваробай трапіла і знаходжанне абітурыента на самаізаляцыі, — праінфармавала Наталля Вайцяховіч. — Пры гэтым да здачы ў рэзервовыя дні дапускаюцца толькі тыя абітурыенты, якія зарэгістраваліся на ЦТ у вызначаныя тэрміны (з 2 мая да 1 чэрвеня), але з уважлівай прычыны не змаглі на ім прысутнічаць. Тэрміны рэгістрацыі абітурыентаў для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні — з 12 да 17 ліпеня.

Наталля Вайцяховіч таксама нагадала, што сёлета павялічылася колькасць пунктаў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні. Калі раней гэта быў толькі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, то сёлета ЦТ у рэзервовыя дні будзе праходзіць таксама на базе ВНУ — каардынатараў ЦТ у кожным абласным цэнтры: гэта Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. Сухога і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы.

Рэзервовымі днямі для здачы ЦТ па беларускай і рускай мовах зацверджаны 19 і 21 ліпеня. Для грамадазнаўства, матэматыкі, біялогіі, замежных моў (англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай, кітайскай), хіміі, фізікі, гісторыі Беларусі, геаграфіі, сусветнай гісторыі (найноўшы час) рэзервовымі днямі будуць 19 і 23 ліпеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Здарэнні

# МАЛАНКА НЕ ЛЮБІЦЬ МАБІЛЬНЫХ ТЭЛЕФОНАЎ

**Пад Баранавічамі двое маладых мужчын лавілі рыбу. Пачалася навальніца, ударыў гром, бліснула маланка. Рыбакі тым часам былі на сярэдзіне вадаёма ў лодцы. У аднаго з іх зазваніў тэлефон у кішэні, ён адказаў...**

Пра далейшае расказаў выратавальнікам яго таварыш па рыбалцы. Відавочца запомніў толькі званок і нейкі выбух, а потым убачыў, як сябар боўтаецца ў вадзе і чапляецца за край лодкі. Мужчына выцягнуў сябрука і папрасіў дапамогі па нумары 101. Машына «хуткай» не магла праехаць на месца здарэння з-за адсутнасці дарогі, на падмогу рушылі ратавальнікі. Чалавека з траўмамі ад удару маланкі даставілі ў бальніцу, там адразу змясцілі ў рэанімацыю.

Пра здарэнне паведамілі ў Брэсцкім абласным упраўленні МНС і нагадалі, што нельга падчас навальніцы карыстацца мабільнай сувяззю — лепш за ўсё адключыць тэлефон наогул.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# НА ВОЗЕРЫ ВЫРАТАВАЛІ МУЖЧЫНУ І ЖАНЧЫНУ

### Дзякуючы ўзаемадзеянню МНС Беларусі і Латвіі

**Увечары ў Рэспубліканскі цэнтр кіравання і рэагавання МНС паступіла паведамленне ад калег з Латвіі пра мужчыну і жанчыну, якія мелі патрэбу ў дапамозе на Асвейскім возеры. Інфармацыя неадкладна была перададзена ратавальнікам Верхнядзвінскага раёна.**

За пяць кіламетраў ад берага, недалёка ад вострава, размешчанага ў цэнтральнай частцы возера, работнікі МНС знайшлі двух грамадзян. Ратавальнікамі яны былі дастаўлены на бераг і перададзены брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі для ацэнкі стану іх здароўя.

Як паведамляе МНС, хутчэй за ўсё, падзеі разгортваліся наступным чынам. Калі выратаваныя выбраліся на возера, пачаўся дождж, падняліся вецер і хвалі, вада пачала траплядь у лодку. Мужчына і жанчына набралі нумар 112, аднак тэлефон гэтым часам знаходзіўся ў зоне дзеяння вышкі сотавай сувязі, якая знаходзіцца ў Латвійскай Рэспубліцы. Злучэнне было ўстаноўлена з дыспетчарам суседняй дзяржавы, бо Беларусь, Латвія і большасць краін Еўропы выкарыстоўваюць адзіны нумар 112 для прыёму паведамленняў пра надзвычайныя сітуацыі. Дзякуючы ўстаноўленым механізмам узаемадзеяння інфармацыя неадкладна паступіла беларускім калегам. Акрамя гэтага, званок мужчыны быў пераадрасаваны наўпрост у МНС Беларусі.

МНС нагадвае: перад выхадам на водную роўнядзь азёр і рэк пераканайцеся ў спрыяльных метэаралагічных умовах, а калі іх няма, адкладзіце прагулку да ўстанаўлення адпаведных умоў надвор'я.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПЕР ГЮНТ. ТАНЕЦ ПРА ПОШУК СЯБЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гісторыя, створаная амаль паўтара стагоддзя таму драматургам Генрыкам Ібсенам і кампазітарам Эдвардам Грыгам, натхняла творцаў з усяго свету на развагі пра самавызначэнне, пошук чалавекам свайго жыццёвага шляху і свайго месца. Прыгоды нарвежскага Адысея шмат разоў расказвалі наноў у тэатральных спектаклях, оперы і балеце, кінастужках, мультфільмах, у скульптуры, музыцы і нават... астраноміі — у гонар адной з гераінь п'есы названы астэроід, які адкрылі ў 1921 годзе. Ішоў «Пер Гюнт» і на беларускай сцэне ў 1966—1978 гадах — балет паставіў тагачасны галоўны балетмайстар Вялікага тэатра Атар Дадзішкіліяні, а за дырыжорскім пультам стаяла адзіная ў БССР жанчына-дырыжор Таццяна Каламійцава. Праз больш чым сорак гадоў пастаноўка вяртаецца ў рэпертуар Вялікага тэатра Беларусі — але гэта будзе, падкрэслівае **харэограф-пастаноўшчык Сяргей МІКЕЛЬ**, зусім іншая гісторыя.



...У тэатры масачны рэжым, на службовым уваходзе ўсім мераюць тэмпературу і нагадваюць пра неабходнасць сацыяльнай дыстанцыі і гігіенічнай бяспекі. Тым не менш у рэпетыцыйнай зале шматлюдна і шматколерна — сёння ў плане не толькі работа балетнай трупы, але і прымерка касцюмаў. «Заходзьце, бяздомныя!» — ласкава запрашаюць на сцэну маладых людзей і дзяўчат у маляўнічых «лахманах». Побач з імі — нарвежскія сяляне, рабочыя-шахцёры, «дзеці пустыні» — бедуіны і купка людзей ва ўсім чорным, уключаючы маскі. Такое адчуванне, што мы трапілі ў вар'яцкі дом. Праз пару хвілін разумеем: так яно і ёсць. Сёння якраз праходзіць рэпетыцыя дзеі, у якой Пер Гюнт пасля мноства прыгод апынуўся ў вар'яцкім доме ў Каіры.



## Ф'ёрды, маскі і панк

«Пер Гюнт» не з тых твораў, які лёгка ўспрымаць непадрыхтаванаму гледачу: у п'есе Ібсена мноства падтэкстаў, складаных персанажаў і намёкаў на канкрэтныя гістарычныя падзеі. Да таго ж у ёй цэлы калейдаскоп лакацый: падзеі адбываюцца ў нарвежскай вёсачцы, у лесе і ў гарах, у пячорах троляў, на ўзбярэжжы Міжземнага мора і ў пустыні Сахара, у моры, у вар'яцкім доме і зноў у Нарвегіі, куды вяртаецца спустошаны галоўны герой. Таму ў **мастака-пастаноўшчыка Любові СІДЗЕЛЬНІКАВАЙ**, што называецца, задача з зорачкай: перадаць каларыт кожнага месца і разам з тым звязаць усю гісторыю — 2 дзеі ў 8 карцінах з пралогам — у адзінае цэлае.

***— Разглядаючы на сайце тэатра эскізы касцюмаў і макеты дэкарацый, мяркуеш, што гэта будзе сцімпанк, сплаў фэнтэзі, тэхналогіі і рэальнасці, — так ці не?*** — пытаюся ў мастачкі.

— Ёсць такі момант, — ківае Любоў Сідзельнікава, — але гэта хутчэй кіберпанк. Мы адмыслова абралі такі стыль, зыходзячы з цяперашніх рэалій, каб ствараць сучасную казку. Бо для Ібсена і яго сучаснікаў у канцы XIX — пачатку XX стагоддзя гэта была наўпрост актуальная гісторыя, расказаная ў казачнай форме, а наша задача была, не адыходзячы ад Ібсена, актуалізаваць герояў і падзеі для XXI стагоддзя. Напрыклад, адным з пазнавальных элементаў сучаснасці стала лічбавая Карпарацыя троляў — у сучасным разуменні гэтых персанажаў. Доўга думалі, як вырашыць вобраз Горнага караля, каб гэта было цікава і самім сабе, і сённяшняму гледачу; яшчэ адна з цікавых і няпростых у рэалізацыі задумак — зрабіць азёры з адлюстраваннямі ў іх... Канешне, спектакль неверагодна складаны ў тым сэнсе, што ён вельмі розны, і каб злучыць усе фрагменты, трэба пастарацца. Але паглядзіце сучасныя фільмы, яны насамрэч усе такія, нібы мазаіка — толькі ў нашым выпадку будзе балет.

Адмысловыя касцюмы, дарэчы, распрацаваны і шыюцца не толькі для балетнай трупы, але і для салістаў оперы (іх у спектаклі 14 чалавек, а вакальныя нумары будуць гучаць на нарвежскай мове). Адзін з галаўных убораў артысткі оперы, напрыклад, зроблены з клубкоў нітак і пруткоў для вязання — як сімвала пераблытаных нітак лёсу, няспраўджаных мар. Наогул вакальны ансамбль прадставяць у выглядзе выязнога тэатра, які пакажа ўстаўны нумар, гэткі «спектакль у спектаклі» — нацыянальныя казачныя героі, вакальныя традыцыі, народныя касцюмы, разнастайнасць і адметнасці нарвежскай культуры.

Дзіўным чынам будуць у «Пер Гюнце» і вострaактуальныя элементы. Хоць амаль год таму, задумваючы для шахцёраў касцюмы з маскамі-рэспіратарамі, мастакі, канешне, уявіць не маглі, наколькі пацэляць у дзясятку з гэтым вобразам.

## Не карміце троляў

Новага наогул будзе многа — у сцэнічным афармленні, касцюмах, сэнсавым напаўненні танца, нават у музыцы — **маэстра Аляксандр АНІСІМАЎ** спалучыў добра вядомыя мелодыі Грыга і свае аўтарскія знаходкі... Але ўсё гэта — у верасні. А пакуль рэпетыцыя ў разгары, і балет раз за разам прымае галоўнага героя ў цесныя абдымкі вар'ятаў. Сцэну ў вар'яцкім доме артысты паўтараюць шмат разоў — яе пастаноўшчык лічыць ключавой для галоўнага героя, а таму абмяркоўвае з занятымі артыстамі балета ўсе нюансы, каб мага паўней раскрыць вобраз.

— Зусім не тое! — харэограф Сяргей Мікель катэгарычны ў ацэнках. — Вы не зомбі, якіх выкручвае ва ўсе бакі, а пацыенты вар'яцкага дома — неабходна перадаць іхнюю асаблівую пластыку. І, калі ласка, не чапляйцеся за верх парталаў, нам трэба паказаць не акрабатычныя нумары «вось як я магу падцягнуцца», а такую крыху незямную гісторыю...

Для Сяргея гэты балет — дэбют на вялікай сцэне, таму некаторыя моманты па складзе выканаўцаў і рэпетыцыйным графіку падказаў яму былы настаўнік, мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Валянцін Елізар'еў. А вось у творчым плане даў поўную свабоду, з якой, трэба адзначыць, харэограф абыходзіцца цвёрда і ўпэўнена. Выпрацоўваючы канцэпцыю пастаноўкі, ён не раз і не два перачытаў п'есу Ібсена, каб глыбей адчуць гісторыю Пера Гюнта, актуалізаваць яе і расказаць на мове танца гледачам.

— Я ні ў якім разе не рамантызую героя. Для мяне Пер Гюнт — не летуценны паэт, які жыве ва ўласным прыдуманым свеце, і не філосаф, які ўсю дарогу шукае сэнс жыцця, а марнатравец, які ў пагоні за ўяўным шчасцем і багаццем не цаніў тое, што было побач, пераступаў цераз іншых людзей і ў выніку страціў тое, што меў, — разважае харэограф. — Асабіста для мяне такія паводзіны непрымальныя.

Магчыма, таму Сяргей Мікель расстаўляе акцэнты не на цэнтральным мужчынскім персанажы, а на жаночых, вельмі розных, але аднолькава моцных: маці героя Озе, сустрэтай у пустыні Анітры, для якой матэрыяльныя каштоўнасці важнейшыя за нейкую там душу, і, безумоўна, вернай Сольвейг, якая становіцца для Пера Гюнта промнем святла і дае надзею на выратаванне. (Дарэчы, ролю ўжо сівавалосай Сольвейг, якая дачакалася свайго каханага і пазнала яго не вачыма, але душой, у спектаклі выканаюць легенды беларускага балета — Вольга Лапо, Інеса Душкевіч, Таццяна Шэметавец.)

***— У «Пер Гюнце» гучыць адна з самых пазнавальных мелодый Грыга — «У пячоры Горнага караля». Плануеце яе абыграць на сучасны лад?***

— Так, у «Пячоры Горнага караля» ў нас будуць асаблівыя тролі — гэткі сімвал сучаснай глабалізацыі, дзіўныя персанажы, якія нават хадзіць будуць задам наперад, а ў цэнтральнай дэкарацыі многія, напэўна, убачаць папулярныя інтэрнэт-рэсурсы, камунікацыі, адкрытыя граніцы — усё тое, без чаго мы ўжо не ўяўляем сучаснае жыццё.

Яшчэ адна навацыя — адсутнасць гендарнага падзелу ў некаторых персанажаў. Напрыклад, безаблічныя і бясполыя на сцэне будуць пацыенты вар'яцкага дома, а таксама многія тролі. Падкрэслена «іншымі» будуць у нас таксама Пугавічнік і яго памагатыя, каб і артысты, і публіка адчулі гэта трымценне на мяжы дабра і зла, — інтрыгуе Сяргей Мікель. — Фінал для мяне самога пакуль што адкрыты. Адзін варыянт адсылае да самой п'есы Ібсена — ён аптымістычны, гэта прасвятленне і шанц на выратаванне, але ёсць і другі варыянт, звязаны з моцным характарам Сольвейг: ці засталася б яна вернай Перу пасля ўсяго таго, што адбылося?.. Многія могуць не пагадзіцца з маім поглядам, але я ведаю свой спектакль і ведаю, што хачу данесці да гледача.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# «Прадстаўленні нават для дзесяці гледачоў»

### Гродзенскі абласны драматычны тэатр працягвае сезон пасля перапынку

**Вымушаны антракт зацягнуўся на два месяцы, адпаведна, і ўвесь тэатральны сезон давялося падкарэкціраваць. Сёлета трупа тэатра мае намер працаваць і летам, у адрозненне ад папярэдніх сезонаў. Будзе прадстаўлена дзве прэм'еры — для дзяцей і для дарослых. Увогуле тэатральная афіша на першы летні месяц даволі насычаная. Мяркуецца адыграць каля 20 пастановак.**

— Паціху мы вяртаемся ў наша звыклае кола, — кажа **дырэктар Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра Ігар ГЕДЗІЧ.** — Першыя спектаклі пасля вымушанай паўзы ўжо адбыліся. Мы паказалі пастаноўку для дзяцей. І хоць у зале прысутнічала толькі адна сям'я з дзецьмі, мы яго не адмянілі. Таксама адбыліся два спектаклі для дарослых, у тым ліку, адзін прэм'ерны — «Удава, каратышка, цюлень і іншыя».

Як правіла, лета — не самая лепшая пара для тэатраў. Звычайна гэта час адпачынкаў і ў саміх тэатрах. У гродзенцаў, як правіла, уся трупа бярэ «перапынак» у жніўні, а ўжо з 1 верасня пачынаецца новы тэатральны сезон. Але сёлета тэрмін работы давялося скарэкціраваць у сувязі з пандэміяй каранавіруса. У выніку красавік і май цалкам выпалі з тэатральнага жыцця.




— Мы ўзнаўляем работу з пэўнымі рэкамендацыямі, — падкрэсліў Ігар Гедзіч. — Касір пры продажы білетаў папярэджвае гледачоў аб масачным рэжыме. Мы бясплатна выдаём маскі. Прадугледжваем таксама і бяспечнае размяшчэнне ў глядзельнай зале. Скажу, што зрабіць гэта нескладана, бо зала разлічана на 665 месцаў. Плануем запаўняць яе не больш чым на 20—25 %.

Зараз у рэпертуары Гродзенскага драмтэатра больш за 40 спектакляў, палова з іх уваходзіць і ў чэрвеньскую афішу. Нямала і камедыйных пастановак, у тым ліку замежных драматургаў. Сярод іх — «Sex, каханне і падаткі», «Шыкоўнае вяселле», «Боінг-Боінг», «Вольная пара», «За двума зайцамі», «№ 13». Вяртаецца на сцэну і вясёлы спектакль «Камедыя пра нешчаслівага селяніна, яго жонку Маланку, жыда Давіда і Чорта, які страціў сэнс існавання». Прэм'ера беларускамоўнага спектакля адбылася 25 гадоў таму, і вось цяпер ён зноў на сцэне.

Некалькі гадоў таму ў тэатры ажыццявілі пастаноўку Адольфа Шапіра «451 па Фарэнгейце». Спектакль пастаўлены паводле вядомага твора Рэя Брэдберы, які ў сярэдзіне мінулага стагоддзя перасцерагаў грамадства ад засілля масскультуры, дзе людзі, здольныя крытычна мысліць, аказваліся па-за законам. 451 градус па Фарэнгейце — гэта тэмпература ўзгарання паперы, кніг, якія нясуць праўду. Дарэчы, нядаўна ў тэатры знята тэлеверсія спектакля. Плануецца, што яна выйдзе на канале мясцовага тэлебачання.

Трэба сказаць, што падчас вымушанага прастою тэатр скіраваўся ў віртуальную прастору. Ёсць свой ютуб-канал. Зроблена некалькі тэлеверсій рэпертуарных пастановак.

— Упершыню мы задзейнічалі для здымак адразу чатыры відэакамеры, што дазволіла атрымаць некалькі ракурсаў, — кажа дырэктар тэатра. — Мы будзем працягваць гэты кірунак, каб пастаянна быць у культурным стрыме, не адыходзіць ад гледачоў.

І ўсё ж галоўныя намаганні калектыву тэатра будуць па-ранейшаму датычыцца тых, хто прыйдзе ў глядзельную залу.

Быць у кантакце з гледачом вельмі важна для артыстаў. За два месяцы акцёры паспелі засумаваць без сваіх гледачоў. Таму цяпер яны гатовы выходзіць на сцэну нават тады, калі ў зале будзе 10—15 чалавек.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

### У тэму

Узнавілі тэатральны сезон і ў Гродзенскім тэатры лялек. Праўда, спектаклі тут будуць праходзіць пад адкрытым небам — ва ўнутраным дворыку. У летнім амфітэатры гледачы ўжо ўбачылі дзіцячы спектакль «Казкі Пушкіна». Тэатр і надалей будзе працаваць у новым фармаце.

Вяртаецца і арт-праект Гродзенскай абласной філармоніі — канцэрты на балконе. Выступленні будуць праходзіць кожны аўторак у 18 гадзін. Усе, хто ў гэты час наведае вуліцу Савецкую ў гістарычным цэнтры горада, змогуць пачуць з балкона музычныя кампазіцыі, песні, арыі з аперэт у выкананні артыстаў філармоніі.

Сямейная газета

Выпуск № 11 (147)

## #ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

*Жывучы ў маладым і густанаселеным раёне сталіцы, за дзесяць гадоў мне разам з дзецьмі давялося качаваць па садках — якраз нядаўна падлічыла, на нашым рахунку іх ажно шэсць, а груп яшчэ больш. І, канешне, кожны раз хацелася знайсці «сваю» выхавацельку, дзякуючы якой адаптацыя ў малых праходзіла б лягчэй, а бацькі на рабоце спакойна выконвалі свае працоўныя абавязкі, а не перажывалі, з якой істэрыкай і «ля скандаль» давядзецца забіраць дзіця ўвечары.*

*Атрымлівалася, як вы разумееце, з пераменным поспехам: кагосьці больш цікавілі запоўненыя паперы і здадзеныя ў апякунскі камітэт грошы, чым апетыт, настрой і паводзіны дзяцей (мадэль «іх многа, а я адна»), хтосьці, наадварот, стараўся больш абмяркоўваць з бацькамі дзіцячую псіхалогію, дзяліўся парадамі і нават скідваў на тэлефон здымкі, як малыя, якія зранку дружна раўлі ў раздзявалцы, спакойна малююць, ядуць і гуляюць на вуліцы. Адна з выхавальніц запомнілася асабліва — тым, што проста прымала дзяцей з рук на рукі, як сумку ў камеру захоўвання, а ўвечары так жа без эмоцый выдавала назад, на ўсе роспыты бацькоў адказваючы дзяжурным «нармальна». Яна не была дрэнным ці злым чалавекам, толькі раўнадушным — і гэту абыякавасць раней за нас, дарослых, адчувалі дзеці, якія менавіта з ёй часцей капрызілі і сваволілі, сварыліся паміж сабой і хадзілі няўмытыя.*

*На шчасце, з усіх шасці садкоў гэта быў адзіны выпадак, і нашы пакутлівыя стасункі з выхавацелькай працягнуліся ўсяго пару месяцаў. Таму сёння ў мяне ўжо няма жадання разважаць, што чалавек не рубель, каб усім падабацца, і што, магчыма, і я, і ўсе астатнія «я ж маці» самі рабілі нешта не так, і мо трэба было пастарацца наладзіць кантакт, або больш цісnуць на загадчыцу садка, якая адрэкамендавала гэту супрацоўніцу як добрага спецыяліста... Негатыў і без таго запамінаецца лепш за дабро, таму лішні раз згадваць пра яго не хочацца. Затое хочацца яшчэ раз падзякаваць вялікай колькасці іншых людзей, якіх пашчасціла сустрэць на ўласным бацькоўскім шляху (няхай нават яны не ведаюць, што я зараз пра іх пішу). І выхавацелькам, у чые змены нашы дзяўчаткі заўжды былі прыгожа і з выдумкай заплеценыя, як маленькія прынцэсы (хоць, на хвілінку, стварэнне складаных прычосак не ўваходзіць у навучанне санітарна-гігіенічным навыкам і не з'яўляецца абавязкам педагога). І выкладчыцы фізкультуры, якая год (!) змагалася з неспакойнай натурай маёй малодшай і ўсё ж заахвоціла яе да заняткаў, ды так, што тая цяпер з гонарам расказвае і паказвае, чым займалася на фізкультуры. І загадчыцам садкоў, якія ў адказ на падсвядомае чаканне агучанай сумы «добраахвотнай» бацькоўскай дапамогі ўсміхаліся і — не выдавалі квітанцый з абавязковай сумай унёску, а проста расказвалі і паказвалі, чым жыве ўстанова і група, у якой будуць знаходзіцца нашы дзеці. І музычным кіраўнікам, чые раншнікі не ператвараліся ў дзяжурны набор вершыкаў-песенек, а рабіліся сапраўднымі святамі, пасля якіх дзеці, бацькі і педагогі абдымаліся і не хацелі разыходзіцца. І тым работнікам кухні, у якіх маленькія гурманы з ахвотай елі нават рыбнік, манку і іншыя дзіўныя стравы з садкоўскага меню. І ўсім урачам, медсёстрам, лабарантам, для якіх не было праблемай выдаткаваць плюс пяць хвілін часу, каб супакоіць нервовых мам і татаў, пахваліць за мужнасць дзяцей і растлумачыць, чаму і як будзе адбывацца лячэнне. І... Вельмі многа каму яшчэ, праўда.*

*З аднаго боку, з гэтымі эмоцыямі я спазнілася на паўгода, бо сусветны дзень «дзякуй» адзначаецца ў студзені, а зусім не летам. Але з іншага — хіба трэба чакаць канкрэтнага дня, каб сказаць, напісаць, патэлефанаваць і падзякаваць усім тым, каму не ўсё роўна — прыемным, сапраўдным, добрым людзям? І наноў пераканацца ў справядлівасці радкоў, якія напісаў паэт Алесь Бадак: «Розных людзей сустракаў у жыцці — добрых усё-такі болей...»*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

## Станіслаў ТРЫФАНАЎ:

# «Мы з жонкай глядзім у адным напрамку»

### Адна з самых прыгожых пар Вялікага тэатра Беларусі падзялілася сакрэтамі сямейнага шчасця

**Заслужанага артыста Беларусі Станіслава Трыфанава называюць барытонам № 1 Вялікага тэатра. Гэта праўда, што на ім трымаецца амаль увесь рэпертуар. Ён выдатны ў кожным вобразе, ці гэта князь Ігар, Тоніа, Галандзец, ці Рыгалета або Эскамільа. А які моцны вобраз Кізгайлы ў оперы Дзмітрыя Смольскага «Сівая легенда», за работу ў якой Станіслаў Трыфанаў і яго калегі ўдастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі! Яго жонка Дзіяна — таксама салістка беларускага Вялікага. Зрэшты, размаўляць мы будзем пра сямейнае жыццё артыстаў.**




Фота Анжалікі ГРАКОВІЧ.

**Дзіяна і Станіслаў ТРЫФАНАВЫ з дачкой Яўгеніяй і сынам Міронам.**

***— Як адбылося ваша знаёмства?***

**Станіслаў Трыфанаў:** — Мы пазнаёміліся на ўступных іспытах у Адэскую кансерваторыю. Як потым высветлілася з размоў, убачылі адно аднаго яшчэ раней. А не пазнаёміцца не маглі, таму што вучыліся на адным курсе. Дзіначка, думаю, раскажа пра гэта цікавей...

**Дзіяна Трыфанава:** — Калі справа дайшла да эцюдаў, загадчыца кафедры Галіна Анатолеўна Паліванава, дзякуй ёй за гэта, сказала: «Вось там учора дзяўчынка была, давайце мы яе цяпер сюды паклічам, Раманенка Дзіяну». Мяне шукалі па калідорах і класах, сказалі, маўляў, цябе тэрмінова выклікаюць. Мяне папрасілі скласці кампанію непасрэдна Стасу, нягледзячы на тое што я ў чарзе студэнтаў стаяла далёка не побач з ім. Вось там, на сцэне, нас і пазнаёмілі.

***— Ці доўгі быў цукерачна-букетны перыяд?***

**С. Т.:** — У нас не цукерачна-букетны, а музычна-драматычны перыяд быў. Мы неяк адразу адчулі, што знаходзімся на адной хвалі, перш за ўсё гэта датычыцца творчасці. Вельмі шмат займаліся ў опернай студыі: вакал, акцёрскае майстэрства. Гэта значыць, акрамя чалавечай сімпатыі, у нас былі і ёсць агульныя творчыя інтарэсы. Пажаніліся мы праз два гады пасля нашага знаёмства. Думаю, што перыяд заляцанняў, узаемнай цікавасці ў нас яшчэ не скончыўся. Мы ў добрых адносінах. Не ўяўляю, як можа скончыцца цукерачна-букетны перыяд. Што тады? Асобныя рахункі ў рэстаране?

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Нашы дзеці

# НАЗАД... У ІНТЭРНАТ?

### Права на сям'ю, шанц на ўсынаўленне ці непазбежнасць вяртання?

**Што адбываецца з дзецьмі, якія сталі сіротамі ці былі адабраныя ў родных бацькоў? Чаму малых часам вяртаюць з прыёмных сем'яў? Куды трапляюць непаўналетнія, калі закрываюцца інтэрнаты? Чым патранат адрозніваецца ад апякунства? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі спецыялісты.**

## Ад бацькоў — да сваякоў

Летась у краіне мамы і таты 1200 дзяцей былі пазбаўленыя бацькоўскіх правоў. У сталіцы без апекі бацькоў засталіся 223 дзіцяці. 83 % дзяцей уладкаваны ў сям'ю.

Заканадаўча ў Беларусі замацаваны розныя формы сямейнага ўладкавання дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Найперш ім даецца магчымасць трапіць у сем'і сваякоў — апякунскую сям'ю бабуль, дзядуль, блізкіх сяброў і знаёмых, сведчыць **Алена СІМАКОВА, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі:**

— Яшчэ пры падрыхтоўчым этапе калі малых забяруць з сям'і, вядзецца работа па іх далейшым сямейным уладкаванні — падбіраюцца кандыдаты, якія змогуць часова замяніць родных бацькоў, пакуль тыя вырашаюць для сябе, ці змогуць выправіцца. Апека традыцыйна становіцца замяшчэннем роднай сям'і для дзяцей. І акцэнт тут робіцца на тое, што гэта часовы прытулак для малых, акрамя выпадкаў, калі бацькі дзяцей паміраюць ці прызнаюцца адсутнымі без вестак. Калі дзіця атрымала статус і ўладкавана ў сям'ю, пачынаецца работа па яе суправаджэнні, бо малым досыць складана адаптавацца да новых умоў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

# Новыя меры падтрымкі для сем'яў

**18 мая Прэзідэнт Беларусі падпісаў Указ № 171 «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян», які датычыцца ў тым ліку і сем'яў. На якія дадатковыя меры падтрымкі і льготы цяпер зможа разлічваць «ячэйка грамадства»?**

**1.** Для маці, якія нарадзілі чацвёра і больш дзяцей, перыяды, калі яны не працавалі ў сувязі з доглядам малалетніх дзяцей, будуць залічвацца ў агульны стаж працы для прызначэння пенсіі ў межах 12 гадоў. Зараз яны ўлічваюцца ў межах 9 гадоў.

Такім чынам, **максімальны перыяд догляду за дзецьмі, які залічваецца ў агульны стаж для мэт пенсійнага забеспячэння, павялічаны з 9 да 12 гадоў.**

Такая норма будзе прымяняцца не толькі падчас першасных прызначэнняў пенсій жанчынам, якія нарадзілі чацвярых і больш дзяцей, але і да пенсій, прызначаных да 1 студзеня 2021 года.

Пенсіі будуць пераразлічвацца з улікам згаданай нормы з першага чысла месяца, наступнага за тым, у якім жанчына звернецца па пераразлік. Пры гэтым у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне неабходна будзе прадставіць заяву і дакументы, якія пацвярджаюць нараджэнне чацвярых і больш дзяцей і выхаванне іх да 3-гадовага ўзросту (калі такіх дакументаў няма ў матэрыялах пенсійнай справы).

**2.** Таксама зменшаны страхавы стаж для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту жанчынам, якія нарадзілі чацвярых дзяцей і выхавалі іх да 8-гадовага ўзросту.

Так, жанчынам, якія нарадзілі чацвярых дзяцей і выхавалі іх да 8-гадовага ўзросту, працоўная пенсія па ўзросце пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту будзе прызначацца пры наяўнасці **агульнага стажу не менш за 20 гадоў і страхавога стажу не менш за 10 гадоў.**

Нагадаем, што для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце на агульных падставах патрабуецца наяўнасць **страхавога стажу:**

- у 2021 годзе — не менш за 18 гадоў,
- у 2022 годзе — не менш за 18 гадоў 6 месяцаў,
- у 2023 годзе — не менш за 19 гадоў,
- у 2024 годзе — не менш за 19 гадоў 6 месяцаў,
- у 2025 годзе — не менш за 20 гадоў.

**3.** Адрасную сацыяльную дапамогу будуць плаціць даўжэй. Для шматдзетных сем'яў перыяд аказання дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ў выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі павялічваецца з 6 да 12 месяцаў.

Акрамя таго, павялічаны крытэрый патрэбнасці са 100 да 115 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва для прызначэння такой дапамогі. Сёння памер БПМ у сярэднім на душу насельніцтва складае 246,78 рубля.

Удвая вырасце сацыяльная пенсія бацькам дзяцей-інвалідаў.

Сацыяльная пенсія маці і (або) бацьку дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў, якія мелі трэцюю і (або) чацвёртую ступень страты здароўя, прызнаных пасля інвалідамі з дзяцінства I групы, калі бацькі ажыццяўлялі догляд за імі не менш за 20 гадоў, будзе прызначацца ў памеры 130 % бюджэту пражытковага мінімуму пенсіянера.

У маі 2020 года сацыяльная пенсія ў бацькоў дзяцей-інвалідаў склала 123,4 рубля. БПМ пенсіянера складае 187,22 рубля, а 130 % БПМ пенсіянера — 243,4 рубля.

Гэта значыць, памер такой пенсіі вырасце ў два разы і наблізіцца да ўзроўню дапамогі па доглядзе за інвалідам I групы (246,78 руб.) і мінімальнай працоўнай пенсіі па ўзросце (246,85 руб.).

**Сёння ў Беларусі налічваецца больш за 198 тысяч шматдзетных сем'яў.**

**87,5 тысячы складаюць сем'і з трыма дзецьмі, больш за 15 тысяч — з чатырма дзецьмі і 5,5 тысячы сем'яў — з пяццю і больш дзецьмі.**

**4.** З'явіцца адна бясплатная спроба ЭКА.

Шлюбным парам, у якіх абодва сужэнцы з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь і ўзрост жонкі не перавышае 40 гадоў, даецца права на правядзенне адной бясплатнай спробы экстракарпаральнага апладнення (за выключэннем ЭКА з выкарыстаннем донарскіх палавых клетак) пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці супрацьпаказанняў.

Прадугледжаныя новаўвядзенні пачнуць прымяняцца з 1 студзеня 2021 года.

**Святлана БУСЬКО.**

# НАЗАД... У ІНТЭРНАТ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Штогод змяншаецца колькасць дзяцей, якія жывуць у інтэрнатных установах, гэтаксама як і лічба дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў. У 2010-м у краіне было, напрыклад, 25 350 дзетак, якія знаходзіліся на розных формах дзяржаўнага ўтрымання, сёння такіх 19 434.

— У дзейнасці органаў апекі і папячыцельства, якімі традыцыйна былі аддзелы ўпраўлення па адукацыі, адбываюцца пэўныя змены. Падрыхтаваны і ўнесены ва ўрад, напрыклад, праект пастановы Саўміна аб тым, што частку функцый орган апекі і папячыцельства перадае СПЦ — як установам, якія функцыянуюць спецыяльна для таго, каб аказваць дапамогу сем'ям і дзецям у рэгіёнах, — падзялілася спецыяліст.

У Беларусі яшчэ засталіся 12 дзіцячых дамоў і дзве школы-інтэрнаты, шэсць дзіцячых вёсак, тры з якіх дзяржаўныя і тры прыватныя. Пры 142 сацыяльна-педагагічных цэнтрах функцыянуе 101 прытулак. Працуюць і ўстановы для тых, каму патрэбна значна больш увагі. Гэта 19 дапаможных школ-інтэрнатаў для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і 18 спецыяльных агульнаадукацыйных школ-інтэрнатаў, дзе вучацца малыя з парушэннямі слыху, зроку, апорна-рухальнага апарату, цяжкімі парушэннямі маўлення.

## Сям'я прафесійная і часовая

Калі малога немагчыма ўладкаваць у апякунскую сям'ю, яму падбіраюць прафесійную замяшчальную: прыёмных бацькоў ці дзіцячы дом сямейнага тыпу. На сяле такім чынам сфарміравана цэлая сетка, якая адпавядае патрэбам рэгіёнаў. Гэта прыводзіць да таго, што дзіцячых сацыяльных прытулкаў (фактычна, міні-інтэрнатаў) становіцца ўсё менш.

— У замяшчальныя сем'і адпраўляюцца дзеці, адабраныя ад бацькоў часова, або яны маюць патрэбу пабыць па-за межамі сям'і, таму што адзіны бацька, напрыклад, ляжыць у бальніцы, — растлумачыла Алена Сімакова.

Дарэчы, у гарадах з уладкаваннем малых на выхаванне пакуль існуюць пэўныя праблемы, і вельмі вітаецца прыход новых прыёмных бацькоў, якіх сёння не хапае. Уладкаванне ў такія сем'і патрабуе падрыхтоўкі і дзіцяці, і кандыдатаў у прыёмныя бацькі.

— Незалежна ад таго, колькі людзі ўжо працуюць у сістэме адукацыі, ім пастаянна патрэбны падтрымка і павышэнне кваліфікацыі. Апошняе ў нас пастаўлена на прафесійны ўзровень, — падкрэсліла прадстаўніца міністэрства. — Бацькі могуць атрымаць адказы на свае пытанні не толькі ў сваім рэгіёне і краіне ўвогуле, але і праз тэматычныя групы ў сацыяльных сетках. Увогуле выхаванне малога не ў роднай сям'і — цэлы працэс, які мае сваім найлепшым завяршэннем вяртанне дзіцяці ў родную сям'ю. На гэта і скіраваны апекуны і прыёмныя бацькі.

Летась прынамсі 155 дзяцей вярнуліся да бацькоў, якія праз суд даказалі права на выхаванне ўласных малых.

Здараецца, што кандыдатам у прыёмныя бацькі прыходзіцца адмаўляць, нават калі яны прайшлі навучанне і дыягностыку.

— Калі бачна, што ў іх ёсць яшчэ свае нявырашаныя праблемы, калі яны не разабраліся, што адбываецца ў іх уласных сем'ях, з такімі кандыдатамі мы развітваемся, — заўважыла Алена Сімакова. — Здараецца, што ў людзей ёсць негатыўны вопыт выхавання ўласных родных дзяцей. А некаторыя прыйшлі выпадкова, паддаўшыся эмацыянальнаму парыву, а пасля зразумелі, што гэта работа не для іх. Часам мы развітваемся з тымі, хто ўжо працуе з намі, таму што закрываюцца ўстановы.

## Патранат і адмена

Даведацца, што такое сям'я, могуць і дзеці, якія жывуць у інтэрнатах. Падчас канікул, свят, выхадных яны могуць адправіцца ў патранатную сям'ю. Такая сістэма сёння развіваецца не толькі ў дзіцячых дамах і школах-інтэрнатах, але і ва ўстановах прафесійнай адукацыі, напрыклад у ПТВ. У такім узросце падлеткам таксама патрабуецца дарослая падтрымка.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Інтэрнат — далёка не найлепшая форма выхавання дзяцей, таму органы апекі выступаюць за «стварэнне бар'ера на ўваходзе», каб дзеці нават часова не траплялі ў інтэрнат, а адразу ўладкоўваліся ў сем'і. У Беларусі з 19 434 сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў,13 899 выхоўваюцца ў замяшчальных сем'ях. Частка непаўналетніх, якія ўжо вучацца ў ПТВ і пераведзены на дзяржзабеспячэнне, наведваюць патранатныя сем'і.

Летась з 2098 дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у інтэрнаты трапіла каля 11 %. На жаль, ёсць і іншая статыстыка — летась з сем'яў вярнулі 20 малых. Гэта залежыць не толькі ад бацькоў-выхавальнікаў, але адбываецца і з аб'ектыўных прычын, калі выхавацельнік, напрыклад, захварэў і не можа выконваць свае абавязкі.

Колькасць адмены ўсынаўленняў у краіне не больш за 1—2 % ад масіву тых, каго ўсынавілі. Прычыны розныя, і кожны выпадак аналізуецца.

— Некаторыя сем'і захоўваюць таямніцу ўсынаўлення, а калі падлетак падрастае, ён даведваецца ад блізкіх ці сваякоў, што яго ўсынавілі, пачынаецца канфлікт з бацькамі, і яны не вытрымліваюць, — тлумачыць **дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі Беларусі Вольга ГЛІНСКАЯ.** — Здараецца і так, што адзін з усынавіцеляў памірае, а другі не можа адзін справіцца з выхаваннем.

## Дадому — праз цэнтр усынаўлення

Нацыянальны цэнтр усынаўлення Беларусі працуе ўжо 23 гады. У 2003-м ён быў прызначаны цэнтральным органам па выкананні палажэнняў Гаагскай канвенцыі аб міжнародным усынаўленні.

— Асноўная задача нашай дзейнасці — сямейнае ўладкаванне дзяцей, пытанні міжнароднага і нацыянальнага ўсынаўлення, устанаўлення міжнароднай апекі і папячыцельства, трансграннічная ахова дзяцей-сірот і малых, якія засталіся без апекі бацькоў, — абазначыла кірункі дзейнасці Вольга Глінская. — Для рэалізацыі гэтых задач у цэнтры створаны і пастаянна актуалізуецца рэспубліканскі банк даных аб усынаўленні дзяцей.

Яшчэ дзесяць гадоў таму ў базе цэнтра было больш за 9,5 тысячы дзяцей, якія жылі ў інтэрнатных установах. Цяпер такіх засталося 1600. У цэнтры не робяць розніцы паміж звычайнымі малымі і дзецьмі, якія маюць пэўныя асаблівасці. Летась, напрыклад, 17 такіх дзетак перадалі ў прыёмныя сем'і.

З 2013 года цэнтр выдае сваю газету «Домой», якая забяспечвае прафесійнае суправаджэнне і падтрымку замяшчальных бацькоў і спецыялістаў у сферы сямейнага ўладкавання і выхавання дзяцей.

Спецыялісты цэнтра ажыццяўляюць псіхолага-педагагічную дыягностыку, падрыхтоўку кандыдатаў ва ўсынавіцелі і суправаджэнне іх пасля ўсынаўлення. У праграме падрыхтоўкі да ўсынаўлення сёння ўдзельнічаюць неўролагі, юрысты, псіхіятры, а кандыдаты могуць наведаць інтэрнаты ці дамы дзіцяці, каб ацаніць свае магчымасці і рэсурсы, перш чым прыняць да сябе дзіця.

— Кандыдатам ва ўсынавіцелі, якія паспяхова прайшлі падрыхтоўку, выдаецца пасведчанне, якое распрацавана спецыялістамі цэнтра і друкуецца пры садзейнічанні арганізацыі «Юні-Хэлп», — дадала Вольга Глінская.

У цэнтры рэалізуецца таксама шэраг праектаў, скіраваных на аказанне шматбаковай дапамогі сем'ям, якія прынялі да сябе сірату. Праект «Сямейная гармонія», напрыклад, унікальны тым, што спецыялісты цэнтра кансультуюць і дапамагаюць па месцы жыхарства, дзе сям'я і дзіця адчуваюць сябе ў звыклай і спакойнай абстаноўцы. Працуюць таксама і з падлеткамі, дапамагаючы ім у пераходны перыяд. У цэнтры ёсць і спецыяльная школа для татаў. У кожным рэгіёне краіны — клубы падтрымкі сем'яў усынавіцеляў на розных этапах іх жыцця. Супрацоўнікі цэнтра праводзяць анлайн-семінары для спецыялістаў СПЦ і ўпраўленняў аддзелаў адукацыі, кансультуюць сем'і.

Арганізавалі таксама электронную пастаноўку на ўлік кандыдатаў ва ўсынавіцелі.

— Большасць з іх хоча маленькіх дзетак, пажадана дзяўчынку да трох гадоў, — дадала дырэктар цэнтра. Аднак у базе цяпер толькі 31 дзіця да года. Розніца ж паміж усынавіцелем і малым не можа быць большай, чым 45 гадоў.

**Ірына СІДАРОК.**

# СЯМЕЙНАЯ СПРАВА

**Фермерскія гаспадаркі «Краглевічы» і «Аўрусевічы» — гэта непадзельная па духу сямейная справа Віктара Карповіча і яго зяця Генадзя Аўрусевіча, якія жывуць у Краглевічах, што ў Івацэвіцкім раёне на Брэстчыне. Мужчыны «ўцягнулі» ў фермерства ўсіх сямейнікаў: жонку Віктара Іванавіча — Алену Віктараўну, дачку Кацярыну (па мужу Аўрусевіч) і дачку Валянціну. У валоданні кожнага з фермераў па 40 гектараў зямлі, тры гектары падсобнай гаспадаркі — у Валянціны. Але гэта па дакументах. У жыцці — уся выдзеленая зямля апрацоўваецца родам Карповічаў разам, разам вырошчваецца, збіраецца і рэалізуецца ўраджай. І фінансы — пароўну. Як кажуць, і ў радасці, і ў смутку — усё папалам.**



Прыклад патрыярхальнага ўкладу жыцця спадара Віктара — сёння вялікая рэдкасць, але гэта самае каштоўнае для яго пяці ўнукаў, якія адчуваюць сябе ў вёсцы шчаслівымі, бо ў іх (як прызнаюцца самі) ёсць усё, акрамя хіба што «чортавага кола». А з другога боку — разам весела, дружна і надзейна. Добра і вяскоўцам, бо Карповічы ніколі не адмовілі ў дапамозе ў грамадскіх вясковых справах, дапамагаюць і нямоглым, і адзінокім жыхарам вёскі.

**Працуюць сем'і разам, не падзяляючы палі: маўляў, гэта поле маё, гэта зяцева, а гэта — дачкі Валянціны.**

Пра шлях да сваёй справы расказалі гаспадыня Алена Віктараўна з дочкамі, калі мы прыехалі да іх. Мужчын дома не было, яны паехалі па сваіх фермерскіх справах, а жаночая палова чакала нас на прасторнай верандзе за сталом на ўсю даўжыню памяшкання, з адмысловымі лаўкамі, зробленымі з густам «пад даўніну». За кубкам чаю з самавара і вялася гаворка...

— Выбар работы ў вёсцы невялікі. Калі мы прыехалі жыць у Краглевічы, я пайшла рабіць даяркай, а муж кім і дзе толькі не працаваў! І даглядчыкам, і конюхам, і ў брыгадзе паляводаў... Сем гадоў таму на сямейным савеце вырашылі, што самім трэба чымсьці займацца. Ідэю падаў галава нашай сям'і Віктар Іванавіч, які даўно сябруе з фермерамі Тамарай Міхайлаўнай і Васілём Васілевічам Камякамі з Коланска, — расказвае гаспадыня. — Віця мой нагледзеўся на іх і вырашыў сам заняцца фермерствам. Тамара і Васіль нам дапамагалі, вопытам дзяліліся. У іх значна большая гаспадарка, мы ж на сваіх палях вырошчваем толькі моркву і бульбу. Гэта асноўныя культуры. Для севазвароту ёсць палі пад луг, сенакос, сеем збожжавыя, буракі, капусту ўпершыню паспрабавалі летась пасадзіць — не пашкадавалі, усю рэалізавалі... З самага пачатку ўзялі для падсобнай гаспадаркі па тры гектары на сям'ю: я з мужам і дачка з мужам. Першы год быў не вельмі: не хапіла грошай нават пакрыць усе расходы.

***— Не хацелася кінуць пасля першай спробы?***

— Не-не. Наадварот, яшчэ больш упарта ўзяліся. Памылкі былі, як разумеем цяпер. Але ж як інакш набрацца вопыту? А праз некалькі гадоў замахнуліся аж на 80 гектараў. Сёння мы ўжо і самі ведаем, чым апрацоўваць, каб жучок ці чарвячок не пашкодзіў морквачку, калі падкормку ўнесці, пры якіх умовах лепш наогул не ўносіць, каб не нашкодзіць культуры.

З 2013 года пачаўся адлік краглевіцкіх фермерскіх гаспадарак: адна гаспадарка называецца «Краглевічы», другая — «Аўрусевічы». Працуюць сем'і разам, не падзяляючы палі: маўляў, гэта поле маё, гэта зяцева, а гэта — дачкі Валянціны.

— У нас усё разам. І ўраджай, і няўдачы дзелім на траіх. І выручку дзелім на тры сям'і, — дадае дачка Кацярына Аўрусевіч.

Віктар Карповіч у свой час скончыў гідрамеліярацыйны тэхнікум у Пінску, да арміі працаваў на трактары, потым на заводзе ЖБВ у Івацэвічах. Неяк на Купалле трапіў з сябрам на свята ў Стайкі, куды з выязным гандлем прыехала на Купалле і Алена. Яна сама была стайкаўская, старэйшая з чатырох дзяцей. На Купаллі маладыя людзі пазнаёміліся, і гэты дзень стаў для абодвух самым шчаслівым у жыцці. (Штогод з той пары сям'я адзначае знакавую сустрэчу.) Пажаніліся зімой. У студзені сёлета адзначылі жамчужнае вяселле.

Напачатку пасяліліся ў вёсцы Бараны пад Івацэвічамі. Калі малодшай Валі было тры гады, вярнуліся на Целяханшчыну ў Краглевічы, да бацькоў Віктара Карповіча, і чатыры гады жылі разам. Нявестка са свекрывёю ладзілі. Алена Віктараўна на кухні была гаспадыня, бо па адукацыі повар, а свякроў на двары ўпраўлялася. Працавала нявестка ў калгасе даяркай, уставала на досвітку, а калі не паспявала што зрабіць, свякроў дапамагала. І сёння Алена Віктараўна з удзячнасцю ўспамінае свякроў за дабрыню і спагадлівасць, за шчырае сэрца. Кажа, што лепшай ні ў кога ў вёсцы не было.

У 1999 годзе Карповічы атрымалі кватэру. Гэта дом, у якім і цяпер жывуць. Выкупілі, робяць рамонт, кажа гаспадыня. І ў Кацярыны з Валянцінай свае дамы.

***— Не шкадуеце, што ў вёсцы засталіся?*** — пытаюся ў дачок, прыгожых маладых жанчын.

— Мы за вёску. Заўсёды, — адказвае Кацярына. — У нас трохпакаёвая кватэра ў Івацэвічах: трое дзяцей — вось і атрымалі. «Чаго ты не жывеш там?» — пытаюцца знаёмыя. А што мне там рабіць? У нас такая прыгожая вёска! Свабодна, па двары пахадзіць можна. Машына ёсць, сеў і паехаў, куды трэба. На танцы ў Івацэвічы, на мадэльнае дэфіле старэйшых дзяцей важу. Яны не адчуваюць, што жывуць у вёсцы. У Целяханах ёсць школа спартыўная, ездзім і туды. Дачка адна кажа, што ў нас не хапае хіба што «чортавага кола», а астатняе ўсё ёсць. А што кватэра? Клетка.

**«З самага пачатку ўзялі для падсобнай гаспадаркі па тры гектары на сям'ю: я з мужам і дачка з мужам».**

...Развіталіся мы ледзь не сябрамі. Запрашалі нас зноў у госці краглевіцкія людзі, якія знайшлі сябе ў фермерстве. Нялёгкая гэта справа, але калі з аптымізмам, дружна, то і па плячы. Ды і апора яны для вяскоўцаў у любой справе. Надзею маюць на прадаўжэнне фермерства. Разлічваюць і на меншых унукаў.

**Валянціна БОБРЫК.**
**Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.**



Мамін дзённік

# КАЛІ «ШЫШКА» НЕ ЎРОК

**Кажуць, на памылках вучацца. Але, гадуючы ўласнае дзіця, хочаш, каб гэтых агрэхаў было як мага менш. Хоць больш вопытныя бацькі сцвярджаюць: пакуль малое не наб'е «гуз» — прычым і ў прамым, і ў пераносным сэнсе — не зразумее, што так рабіць нельга. Толькі з гэтым можна паспрачацца...**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Днямі Цёмік так захапіўся кіданнем камянёў у лужыны, што ніякія мае ўгаворы і нават запалохванне папругай, калі малы намочыць красоўкі, не дзейнічалі. У выніку, перабягаючы ад адной лужыны да другой, Арцёмка зачапіўся за нейкую палку і паляцеў... На шчасце, не ў ваду. Але хапіла і таго: пры падзенні да крыві абадраў аб камяні ручкі. У хату ўвайшлі, горка равучы, — думаю, больш Цёмка пакутаваў не ад болю, а ад маіх натацый. Супакоіўшыся, памылі рукі, апрацавала ранкі. Дні тры малы паказваў на пальчыкі, са шкадаваннем уздыхаў і згаджаўся са мной, што больш да тых лужын і блізка не падыдзе. Атрымала свае я і ад Цёмавага дзеда, што не дагледзела малога. Але гаворка не пра тое. Ранкі на пальчыках яшчэ не зажылі, а праз некалькі дзён мой сынок зноў пашыбаваў да тых самых лужын...

А напярэдадні свайго другога дня нараджэння Арцём прыціснуў на арэлях ножку. Здорава напалохаў, бо толькі спрабаваў на яе ступіць, як пачынаў плакаць. Прыйшлі дахаты, знялі абутак — усё паўтаралася: бяры яго на рукі і ўсё. Знешне нага не мянялася, але працягly час хадзіць ён так і не згаджаўся. Пакуль не прапанавала тое, што звычайна забараняю: надзьмуць паветраны шарык, залезці на вялікі ложак, дзе спяць баба з дзедам, і пацэліць у люстру, з якой падчас такой забавы падаюць «ледзяшы». Ножка, дзякуй богу, уміг прайшла. Толькі вось жаданне падыходзіць да тых злашчасных арэляў так і не знікла. Як і дакранацца да абагравальніка, аб які ён некалькі дзён таму апёк ручку.

І такіх прыкладаў нямала. Здаецца, і «шышкі» атрыманы неслабыя, але ўрокі ў рэшце рэшт не вынесены. Малы яшчэ, скажаце, што ён разумее... Разумее, яшчэ як разумее! Паказвае, што ад цукерак у яго ружавеюць шчочкі, але не адмовіцца, калі яму пашанцуе атрымаць такі ласунак. Праўда, перад гэтым абавязкова пакажа мне тое, што збіраецца палажыць у рот (і за гэта дзякуй!). Ці навошта хавацца з бацькавым тэлефонам за свой ложачак, калі не ведаць, што пры выяўленні згубы гаджэт у малога абавязкова канфіскуюць? Каб нічога не разумеў, напэўна, не лашчыўся б і не лез бы з пацалункамі, калі нашкоднічае.

Але ёсць ва ўсім гэтым і нешта аптымістычнае. Сама здзівілася, калі, упершыню стаўшы на самакат, Цёмка раптам кінуў свой транспарт і пабег на траву — у двор заварочвала машына. Таму дарэмна сяброўкі жартуюць, што ў Мінску малому будзе нязвыкла ад вялікай колькасці аўтатранспарту: маўляў, гэта ў вёсцы ён ходзіць ды ездзіць, дзе ўздумаецца. Аказалася, не зусім ужо ён у мяне бясстрашны. Цёміку толькі два гадкі споўнілася, а што такое «зебра», мой Арцём ужо ведае. Ці ўсё ж разумее, што можа добра ўляцець па «пятай кропцы», калі не там пяройдзе дарогу?

**Вераніка КАНЮТА.**

Сямейны доктар

# УСЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА...

**Што павінна насцярожыць маці і якія праблемы прыводзяць да дзіцячага гінеколага? У якім узросце дзяўчына можа пачынаць палавое жыццё? І што да гэтага часу яна павінна ведаць? Пра гэтыя і іншыя аспекты інтымнага здароўя падлеткаў мы пагаварылі з дзіцячым гінеколагам медыцынскага цэнтра ЛОДЭ Аленай ЯКУТА.**



***— Алена Аляксандраўна, што павінна ведаць дзяўчынка перад пачаткам пераходнага ўзросту?***

— Тое, што звычайна ва ўзросце ад 10 да 13 гадоў у яе могуць з'явіцца крывяністыя выдзяленні на бялізне. Пачатак менструацыі ў 14 або 15 гадоў — таксама варыянт нормы. Відавочна, што пра гэта ёй павінна сказаць мама і акцэнтаваць увагу на тым, што гэта не праява нейкай хваробы. Нярэдка першыя месячныя суправаджаюцца болем у жываце і празмернымі выдзяленнямі. Дзяўчынка можа падумаць, што з ёй штосьці не так, і спалохацца. Усе гэтыя кропкі над «і» павінна расставіць мама, растлумачыўшы, што гэта нармальная фізіялагічная з'ява, якая сведчыць пра тое, што ў будучым дзяўчына зможа мець дзяцей.

Акрамя гэтага, мама абавязкова павінна пакласці ў школьны заплечнік некалькі пракладак і растлумачыць, што калі такое здарыцца ў школе (ці дома, калі яна будзе адна), дзяўчынка павінна прымацаваць пракладку да бялізны. Калі выдзяленні празмерныя ці яны суправаджаюцца моцным болем, прычым не толькі ў нізе жывата, але і галаўным, у спіне, то пра гэта абавязкова трэба паведаміць даросламу. Калі дзяўчынка ў школе, то павінна сказаць настаўніцы ці медработніку, калі дома — маме. Гэта два моманты, на якія трэба звярнуць увагу, калі гэта адбываецца ўпершыню.

**«З вопыту кантактавання з падлеткамі можна зрабіць выснову, што ў 15-16 гадоў яны не моцна азадачаны пытаннямі кантрацэпцыі. Я часта атрымліваю адказ, што яны ніяк не засцерагаюцца».**

***— На што варта звярнуць увагу далей? Што не павінна насцярожваць і з чым, наадварот, трэба звяртацца да ўрача?***

— Пачну з таго, што з'яўляецца нормай. У першыя паўтара — два гады цыкл можа быць нерэгулярны, і гэта з'яўляецца фізіялагічнай нормай. Пакуль цыкл устанаўліваецца, інтэрвалы паміж месячнымі могуць быць ад двух тыдняў да трох месяцаў. І першыя паўтара — два гады можна наогул гэтага моцна не турбавацца. Працягласць саміх месячных у норме складае ад двух да васьмі дзён. Як два дні, так і восем з'яўляюцца варыянтамі нормы. Наконт празмернасці: яны лічацца такімі, толькі калі выклікаюць вымушаную замену санітарных сродкаў часцей, чым раз на дзве гадзіны, або калі дзяўчыны трэба спецыяльна ўставаць уначы, каб іх змяніць, або калі ў аналізах крыві (агульным ці біяхімічным) узнікаюць змяненні, звязаныя з дэфіцытам узроўню гемаглабіну і сываратачнага жалеза, або калі месячныя выклікаюць змену рытму жыцця: дзяўчынка не можа наведваць школу. Калі выкарыстоўваецца 3-4 пракладкі ў суткі, гэта нармальна, хоць мамы лічаць, што гэта вельмі шмат, і часта на прыёме я чую такія скаргі.

Што датычыцца балючасці, то ў норме яна можа прысутнічаць, але ў лёгкай форме, якая не патрабуе прымянення абязбольвальных прэпаратаў, не суправаджаецца галаўным болем, болем у жываце, прамой кішцы, дыярэяй і, зноў-такі, не патрабуе змены рытму жыцця. Ад усяго пералічанага залежаць паказанні да кансультацыі дзіцячага гінеколага. Калі месячныя не пачынаюцца ў 15 гадоў ці ў 13 няма прыкмет палавога саспявання, неабходна звярнуцца да ўрача для высвятлення прычын. Калі месячныя вельмі частыя — ідуць праз кожныя два тыдні, — гэта нагода наведаць доктара. Калі іх няма больш за два-тры месяцы — таксама. Доктар высветліць, чаму яны затрымаліся, і параіць, што зрабіць, каб з прыходам яны не перайшлі ў кровацячэнне.

Яшчэ адзін важны паказчык — працягласць месячных. Калі яны доўжацца больш за восем дзён, нават калі выдзяленні зусім мізэрныя, гэта абавязковая нагода для наведвання дзіцячага гінеколага. Як і ў выпадку, калі з'яўляюцца крывяністыя выдзяленні паміж менструацыямі. Што датычыцца балючасці, то калі дастаткова адной таблеткі звычайнага абязбольвальнага прэпарату, гэта не страшна. А вось калі жывот баліць так, што абязбольвальнае патрэбна неадноразова, калі яго даводзіцца выкарыстоўваць на працягу некалькіх дзён без асаблівага эфекту — у такім выпадку трэба ісці да ўрача.

Акрамя гэтага, нагодай для звароту да гінеколага ў любым узросце з'яўляюцца боль унізе жывата, жаўтавата-зеленаватыя выдзяленні, якія суправаджаюцца свербам, пякотай, дыскамфортам, болем пры мочаспусканні, наватварэнні ў вобласці вонкавых палавых органаў. А пасля надыходу менструацыі — і пытанні, звязаныя з касметалогіяй, у прыватнасці, з'яўленне акнэ і выпадзенне валасоў.

***— Прышчы — таксама нагода звярнуцца да гінеколага?***

— Нярэдка іх лечаць у дэрматолага, а эфекту няма. Адной з прычын можа быць гінекалагічная паталогія, у прыватнасці, эндакрынапатыя, або парушэнне ўзроўню гармонаў. Гэта варта праверыць, а таксама зрабіць УГД малога таза.

***— Калі ў далейшым дзяўчынка-падлетак ні на што не скардзіцца, мама штосьці павінна кантраляваць?***

— Па-першае, пацікавіцца рэгулярнасцю цыкла. Падлеткі звычайна нават не звяртаюць на гэта ўвагі. Па-другое, спытаць пра празмернасць, працягласць і балючасць. Гэта размова літаральна пяці хвілін.

***— Якія парушэнні сёння часта сустракаюцца ў дзяўчат?***

— У кожным узросце — свае. Ад нараджэння да васьмі гадоў, калі ў норме яшчэ няма прыкмет палавога саспявання, бацькі найчасцей звяртаюцца з запаленчымі захворваннямі наружных палавых органаў і з утварэннямі спаек паміж малымі палавымі губамі, так званымі сінэхамі. З васьмі да дванаццаці гадоў праблем, як правіла, няма. Асноўныя пытанні ўзнікаюць у дванаццаць гадоў і пасля, калі пачынае фарміравацца менструальны цыкл. Найбольш частыя прычыны звароту — яго парушэнні (вельмі частыя месячныя ці, наадварот, з затрымкамі), балючасць, боль унізе жывата, якія звычайна звязаны з функцыянальнымі кістамі — іх шмат сустракаецца ў гэты перыяд, — а таксама парушэнні ўзроўню гармонаў.

***— Як часта дзяўчынка павінна наведваць гінеколага?***

— Згодна з адпаведным загадам Міністэрства аховы здароўя, дзяўчынка ў 11-12 гадоў павінна прайсці агляд дзіцячага гінеколага, які вызначае, ці правільна фарміруюцца другасныя палавыя прыкметы. Пасля першых месячных маме трэба прывесці дзяўчынку да доктара, каб запэўніцца, што ўсё ў парадку. А пачынаючы з 14 гадоў — штогод.

***— У якім узросце з пункту погляду медыцыны дзяўчына можа пачаць палавое жыццё?***

— З пункту погляду падлеткавай гінекалогіі я не раіла б пачынаць палавое жыццё да 18 гадоў. У нас гэта пэўная прававая граніца, але яна і фізіялагічная, і псіхалагічная. Узрост палавой згоды надыходзіць у 16 гадоў, і тэарэтычна можна пачынаць у гэтым узросце без якіх-небудзь прававых наступстваў для дзяўчыны і для партнёра. Але ў абсалютнай большасці дзяўчат у гэтым узросце яшчэ ідзе фарміраванне менструальнага цыкла. Яго правільнае ўстанаўленне — залог здароўя рэпрадуктыўнай сістэмы ў далейшым. Дзяўчаты, якія пачынаюць палавое жыццё ў 15-17 гадоў, сутыкаюцца з неспрыяльнымі наступствамі, у прыватнасці фізіялагічнымі. Найперш гэта рызыка нежаданай цяжарнасці. Узнікае пытанне, што рабіць далей. Перарваць, пасля чаго ўзнікае вялікая імавернасць бясплоддзя ў будучым? І гэта пытанне часам не ў стане вырашыць нават мама, не тое што сама дзяўчынка.

Яшчэ адзін фізіялагічны аспект — інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Сярод іх — вірусныя, якія, аднойчы трапіўшы ў арганізм, застаюцца там назаўсёды. Размова ідзе пра ВІЧ, вірусы герпесу, гепатыту В і С. З вопыту кантактавання з падлеткамі можна зрабіць выснову, што ў 15-16 гадоў яны не моцна азадачаны пытаннямі кантрацэпцыі. Я часта атрымліваю адказ, што яны ніяк не засцерагаюцца.

Ёсць і псіхалагічныя аспекты. Як правіла, уступленне ў палавую сувязь дзяўчат прадыктавана дзвюма прычынамі. Першая — страх страціць сябра, які кажа: калі ты мяне кахаеш — дакажы. А другая — жаданне быць як усе. Гэта надзвычай важна для падлеткаў ад 13 да 18 гадоў, і гэтае жаданне часам дыктуе ўчынкі, зусім не характэрныя для іх. Колькі б ні пыталася ў дзяўчат, ці спадабалася ім, мне ні адна не сказала, што атрымала задавальненне. Наадварот, кажуць, што адчулі боль, сорам і шкадаванне. І гэтыя псіхалагічныя наступствы разам з бояззю цяжарнасці і інфекцыі навальваюцца на дзяўчынку. А калі цяжарнасць надышла, пра гэта яшчэ трэба сказаць і маме... Часам мы сутыкаемся з сямімесячнымі цяжарнасцямі, таму што дзяўчынцы страшна прызнацца маме, а сама яна не заўважае.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

У 18 гадоў абсалютная большасць дзяўчат саспявае фізіялагічна, псіхалагічна яны больш падрыхтаваны, маюць больш вопыт узаемаадносін з навакольнымі, таму гэта больш прымальны ўзрост.

***— Што да гэтага часу павінна растлумачыць мама?***

— Агульнае ўяўленне пра палавы акт і палавое жыццё сённяшнія падлеткі маюць гадоў да 12-13. І ў 15-16 гадоў самы час сарыентаваць дзяўчынку: калі яна вырашыць пачаць палавое жыццё, у першую чаргу трэба паклапаціцца пра сваё здароўе. Хлопцы, як правіла, не засцерагаюцца: ён здаровы, у яго нічога не баліць, ты ў яго першая — гэта стандартны набор апраўданняў 16-гадовага падлетка. Таму мама дзяўчынкі павінна проста папярэдзіць, што варта карыстацца прэзерватывам, у тым ліку ў першы раз. Бо і першым разам магчымыя і цяжарнасць, і інфекцыі.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

З пошты «СГ»

## Ідэальныя магчымасці для недасканалага чалавека

**У вас ёсць хто-небудзь, каго вы прымаеце цалкам? Не павучаеце, не пераробліваеце, не чытаеце маралі, не закатваеце вочы, калі чарговы раз нешта ідзе не па-вашаму?**

У мяне няма. У кожным хоць штонебудзь ды не так. Нават самы цудоўны не бездакорны. Нават у самым блізкім знойдзецца дробязь, якая нервуе і раздражняе. Непрыемная звычка, слова-паразіт, рыса характару, рыса твару ці самае страшнае — погляд на важныя рэчы, адрозны ад майго.

Адзін блізкі знаёмы заўсёды са смехам расказвае пра чужыя праблемы. Звычайна гэта абсурдныя сітуацыі, нібыта нават камічныя, але яны заўсёды патрабуюць спачування. І я ведаю, што ён спачувае. Гэта чалавек з добрым, чулым сэрцам, які шмат разоў даказваў гэта на справах. Але тое ніяк не замінае яму пасмейвацца з чужых памылак. Такая манера. Ці абарончая рэакцыя. Ці хто яго ведае што. Але я кожны раз злуюся, калі ён дзеліцца сумным праз смех. І ведаю ж, што не жадае кепскага, што апавядае, каб навучыць на чужых памылках. Усё адно злуюся. І папраўляла, і ўшчувала, і прасіла — нічога не змяняецца. Ён смяецца — я злуюся. Так моцна, што кожны раз абяцаю больш не абмяркоўваць з ім сур'ёзныя тэмы. Але як ты пазбегнеш — у іх самае жыццё.

І вось аднойчы, калі я зноў спрабавала суцешыць сваю рэакцыю на «хаха» знаёмага, у маю галаву пастукалася думка, што мы ўсе — чыесьці памылкі. Кожны чалавек фарміруецца пад уплывам мноства іншых. Мы «забіраем» ад бацькоў, сяброў, настаўнікаў, кніг, кінагерояў, значных і малаважных людзей тое, што нам падабаецца ў іх, і тое, што самі не хацелі б атрымаць. Недзе ён злавіў гэту звычку — падаваць сумныя гісторыі камічна. Яна сфарміравалася ў пэўных умовах і з пэўнай прычыны, мне невядомай. Дык чаму я вырашыла, што магу забараніць яму яе?

Яшчэ прыклад. Наталля — клапатлівая шматдзетная мама, дбайны педагог, спагадлівая жонка, тонкая душа і далікатная сяброўка. Але ўвесь час незадаволеная сабой. Усё не так і не гэтак. Там недарабіла, тут не прадугледзела — паўсюль вінаватая. Грызе сябе пагрызам. Пры сваёй занятасці пайшла ў аўташколу, на швейныя курсы запісалася. Гляджу і думаю: мне б так імкнуцца, паспяваць, быць такой жа адказнай і мэтанакіраванай. А яна зноў наракае: за рулём — як нязмека, за машынкай — крываручка.

Павучыцца б Наташы ў Касі. Гэтая за што ні возьмецца, усё ў яе ладзіцца, і яна ў гэтым не сумняваецца. І бізнесам кіруе, і дома спраўляецца, і дзетак выхоўвае ідэальна. Прыгожая, стыльная, начытаная, эрудзіраваная, энергічная. Ці не ідэал? А вось і за ёй загана водзіцца — з мужа падабласніка зрабіла. Прыгняла мужыка, сырыцу з яго выкручвае.

Не бывае ідэальных. Чалавек па прыродзе сваёй недасканалы. Мы хоць і створаныя па вобразе Божым і падабенстве, але страцілі сваю бязгрэшнасць яшчэ праз прашчура Адама. Не анёлы мы, не святыя. Варта пра гэта памятаць, крытыкуючы звычкі мужа, неахайнасць дзяцей і густ сяброўкі. І як ні імкніся да ідэалу, недасяжны ён нам. Але вось што важна: імкнуцца трэба. Імкнуцца неабходна. Цягніся да праўды і святла. Рабі з усяе моцы, з найлепшых памкненняў. Гары на максімуме, бяжы на ўсе жылы, скачы так высока, як можаш. І, магчыма, менавіта ты будзеш тым самым неідэальным героем, які бліжэй за ўсіх дацягнуўся да Бога.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА.**

# «Мы з жонкай глядзім у адным напрамку»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

***— Як вы ставіцеся да вопыту сумеснага жыцця да рэгістрацыі шлюбу?***

**С. Т.** — Шчыра кажучы, мне здаецца, што гэта дрэнна. Калі сыходзяцца маладыя людзі і пачынаюць суіснаваць разам, то заканчваецца салодкая любата спатканняў і пачынаецца жыццё. Жыццё як прыцірка характараў. І людзі, ужо звязаныя шлюбам, то-бок рашэннем, што сумеснае жыццё будзе доўгае, шукаюць і знаходзяць у сабе сілы, каб навучыцца быць разам, навучыцца трываць недахопы, даравань нейкія негатыўныя моманты, якія ёсць у кожнага чалавека. І мне здаецца, толькі шлюб, адказнасць за будучыню стымулюе такія паводзіны. Інакш жа людзі жывуць разам паўгода-год, зноў мяняюць партнёра, а за гэты час збіраюцца нейкія крыўды, фарміруецца прадузятасць, і вось так з'яўляюцца адзінокія людзі ва ўзросце.

Кажуць, што першыя тры гады шлюбу ён і яна правяраюць адно аднаго, назапашваюць сямейны імунітэт, гэта значыць ім трэба перахварэць на ўсе хваробы росту: пасварыцца, пляснуць дзвярыма, калі гэта людзі з характарам, сысці жыць да мамы. Адразу абмоўлюся, што ў нас такога не было, неяк усё ішло гладка без пераходных перыядаў.

**«Ні адзін чалавек, які не выходзіў на сцэну, не разумее нашых перажыванняў, нашых душэўных выдаткаў, нашай спецыфікі».**

І потым, адносіны без дакументальна афармленых абавязацельстваў недазвальняльныя ў дачыненні да жанчыны. Таму што жанчына, як бы яна сябе ні паводзіла, ні стымулявала мужчыну ў яго імкненні да свабоды, шукае абароны. І шлюб для яе — у першую чаргу момант душэўнага спакою і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

***— Тое, што ў сям'і два чалавекі маюць адну прафесію і служаць у адным тэатры, мае больш плюсоў ці мінусаў у жыцці па-за сцэнай?***

**С. Т.** — У нас абодвух гэта першы шлюб, таму іншага вопыту няма. Але я думаю, што плюсоў, калі людзі адной творчай прафесіі ствараюць сям'ю, больш. Ні адзін чалавек, які не выходзіў на сцэну, не разумее нашых перажыванняў, нашых душэўных выдаткаў, нашай спецыфікі. Растлумачыць гэта немагчыма, а дзівацтваў у артыстаў, у спеваку шмат. Таму мне здаецца, што лепшы шлюб з калегай. Яшчэ ёсць такі момант: важна, каб цябе хтосьці чуў з боку, таму што спявак не вельмі чуе, што ён выдае вонкі. Калі цябе слухае блізкі чалавек, ты можаш разлічваць на шчырасць, на сумленнасць. Так што плюсоў больш, у любым выпадку.

**Д. Т.** — Мінусаў у тым, што людзі працуюць разам, не бачу. Мы ж не сядзім у адным пакоі офіса. Хоць працуем у адным калектыве, але ў нас могуць быць рэпетыцыі ў розны час, у розных памяшканнях, з рознымі дырыжорамі і рознымі партнёрамі па сцэне. Нас гэта толькі ўзбагачае. Я бачу мінусы, калі людзі не разумеюць адно аднаго ў сваіх


Дзіяна ТРЫФАНАВА.

прафесійных сферах. Напрыклад, у нашай сакурсніцы па кансерваторыі муж быў марак, і ён здзіўляўся, чаму яна ходзіць на спектаклі з рознымі складамі артыстаў.

***— Нешта не згадаю, каб у адным спектаклі ўдалося паслухаць вас абодвух...***

**С. Т.:** — Ведаеце, у дзень вялікага спектакля трэба, каб цябе нехта падтрымаў, каб узяў на сябе ўсё, што вакол адбываецца, калі спеваку не да гэтага. Трэба разумець, што ён знаходзіцца трохі ў неадэкваце, нейкія рэчы робіць незразумелыя, не чуе, што вы кажаце яму, увогуле паводзіць сябе так... цікава. Таму дрэнна, калі абодва знаходзяцца ў такім стане. Добра, калі адзін дапаможа, падрыхтуе ўсё, а другі пойдзе і вельмі добра і прыгожа праспявае спектакль. Мы гэта даўно для сябе вырашылі. І калі пераехалі ў Мінск, толькі аднойчы разам спявалі ў оперы «Баль-маскарад».

***— Як так атрымалася, што вы жылі і працавалі ў Адэсе, а старэйшую дачку Дзіяна нарадзіла ў Беларусі?***

**С. Т.** — Адэса — горад спецыфічны, там зімой холадна, летам горача, часта няма гарачай вады. Мы былі маладымі людзьмі і здавольваліся забяспечаным тэатрам мінімалізмам у побыце. Але для маленькага дзіцяці такія ўмовы мала падыходзілі. Ну і медыцына была, скажам так, вельмі платная, якой мы, да таго ж, не зусім давяралі. Мая мама жыла ў Гродне, Дзіна бачыла, што тут у плане медыцыны ўсё значна лепш. Нават не думаю, што я быў ініцыятарам, мне здаецца, гэта было рашэнне Дзіны.

**Д. Т.** — У Стаса ў той год было запланавана вельмі шмат гастроляў з Адэскай і з Кішынёўскай операй. Ён тры месяцы павінен быў спяваць у Англіі, паўтара — у Іспаніі. Так атрымлівалася, што я надоўга заставалася фактычна адна. А ў Гродне я і Жэнечка былі побач з нашай любімай бабуляй. Пры першай магчымасці Стас прыязджаў да нас. Не ўпэўненая, што цяпер я зрабіла б так, бо фактычна два гады мы жылі ў расстанні. Але тады так складваліся абставіны, і, лічу, мы добра пражылі той нялёгкі перыяд. Вядома, вялікі дзякуй маёй былой свякроўе, якая акружыла мяне і Жэнечку любоўю і клопатам. Усё было выдатна. Я закахалася ў Гродна і тады ж палюбіла Беларусь, нават падумала пра тое, што добра было б застацца тут жыць.

***— Колькі гадоў розніцы паміж вашымі дзецьмі?***

**С. Т.** — У нас двое цудоўных дзяцей. Старэйшая дачка — Жэнечка, ёй 15 гадоў, — і сын Мірон, якому 5 гадоў. Дзеці ў нас з'явіліся з вялікім перапынкам, вядома, гэта зусім новыя адчуванні. І гэта звязана не толькі з розніцай ва ўзросце, але і з тым, што яны зусім розныя людзі. Усё гэта непаўторна. Дзеці — вельмі вялікая гама эмоцый і пачуццяў. Нашы дзеці вучацца сябраваць, вучацца жыць разам і знаходзіць агульную мову, гэта выдатна.

**Д. Т.** — Так склалася, што мы ніколі не былі маладымі бацькамі, у нас заўсёды быў усвядомлены падыход да бацькоўства. Пажаніліся мы ў 23 гады, а наша старэйшая дачка з'явілася на свет, калі нам было па 32. Гэта ўжо не такія маладыя, бестурботныя людзі, у нас усё было па-сур'ёзнаму. У нашым выпадку, думаю, цікавая не розніца ва ўзросце дзяцей, а тое, што іх стала двое. З другім дзіцем лягчэй, таму што ёсць вопыт. Ты ўжо да нечага ставішся спакайней, разумееш, што трэба больш давяраць дзіцяці. Жэнечка вельмі прасіла ў нас браціка ці сястрычку, дарэчы, ёй было ўсё роўна хто, галоўнае, каб быў. Праўда, яшчэ раней яна прасіла сабаку. Мы здзейснілі ўсе яе мары. Вялікае шчасце, што ўсе нашы мары — агульныя.

***— Ці можна сказаць пра вашых дзяцей, што яны выраслі за кулісамі?***

**С. Т.** — Яны, вядома, людзі тэатральныя. Жэня была часткай тэатра, брала ўдзел у спектаклях «Яўгеній Анегін», «Чароўная флейта». Цяпер ужо Міроша ўваходзіць у той узрост, калі бывае ў тэатры. Яго ўсе песцяць, усе любяць. У нас ёсць «чароўны пакой», у якім спачатку вырасла Жэнечка. Так яго называюць дзеці, а наогул гэта пакой рэквізіту, у якім захоўваюцца пісталеты, шпагі, кароны і яшчэ шмат усяго цікавага. Таму дзеці там з задавальненнем бавяць час.

**Д. Т.** — Жэнечка скончыла музычную школу і ўжо 11 гадоў з'яўляецца ўдзельнікам узорнага калектыву народнага танца. У яе сваё актыўнае творчае жыццё, якому мы рады і заўсёды падтрымліваем Жэню ва ўсіх яе пачынаннях. Што датычыцца малодшага сына, то ён, што мяне здзіўляе, імкнецца да матэматыкі. Мы ходзім на падрыхтоўчыя заняткі да школы, і ён там сябе вельмі добра праяўляе. Мірон не так часта бывае ў тэатры, як у свой час Жэня, таму што, на жаль, у мяне цяпер менш работы. Сын ужо сказаў нам, што яму падабаецца спяваць у хоры, так што цікавасць да музыкі ў яго таксама праяўляецца.

***— Як у вашай сям'і прынята распараджацца фінансамі?***

**Д. Т.** — Вельмі проста. Я аплачваю ўсе бытавыя пытанні: кватэра, інтэрнэт, садок, заняткі дзяцей. На гэта сыходзіць амаль уся мая зарплата. Усё астатняе — я ведаю, што ў нас у доме будзе. Я ніколі не гляджу разліковы лісток Стаса. У нас зарплаты штомесяц вар'іруюцца ў залежнасці ад занятасці ў спектаклях. У прынцыпе, мы прагаворваем, што нам трэба набыць, але сур'ёзнай хатняй бухгалтэрыі не вядзём, проста не прыдатныя да гэтага.

***— А як размеркаваны бытавыя клопаты? Вось калі няма настрою займацца хатнімі справамі, гэта вырастае ў праблему?***


Опера «Сівая легенда», Кізгайла — Станіслаў Трыфанаў.

**С. Т.** — Быт у асноўным на Дзіне. Мне здаецца, гэта такі нармальны сямейны ўклад, калі дом трымаецца на жонцы. А мы ўсе на падхваце. Нават Міроша ўжо можа выканаць невялікія просьбы: запісаць паказанні лічыльніка, вынесці смецце. Ён ужо некалькі разоў мыў посуд, стоячы на прыстаўным зэдліку. Вось так агульнымі намаганнямі спраўляемся, і праблем на глебе побыту, на шчасце, не ўзнікае.

**Д. Т.** — Усё неяк адбылося само сабой. А потым я прачытала недзе, і мне гэтая думка вельмі спадабалася: кожны павінен займацца тым, што ён любіць, а не па прынцыпе: ты абавязаны. Мой муж вельмі любіць рабіць пакупкі. У яго выдатна атрымліваецца, ён ведае, што, дзе, у якой краме набыць. Я яму цалкам давяраю і вельмі ўдзячная Стасу, што ён узяў на сябе гэтыя клопаты. Мы з дзецьмі ведаем, што тата ідзе ў краму і купіць усё самае лепшае.

Я — сава, і раніцай пакуль яшчэ прыйду ў тонус... А Стас — наадварот, жаўрук. Дык вось, сняданак у сям'і ёсць, і мы за гэта вельмі любім нашага тату. А што датычыцца абедаў і вячэр — гэта мой клопат, гатую я ад душы, з задавальненнем. Вельмі добра, калі кожны робіць тое, што любіць, што не ў цяжар. Калі Стас бачыць, што я стамілася, ён усё возьме на сябе.

***— Як праводзіце адпачынак?***

**С. Т.** — Дзіначка адэсітка, я таксама люблю мора, тут нашы густы цалкам супадаюць. Наогул для нас адпачынак асацыюецца з морам. Сёлета, падобна на тое, мы нікуды не зможам з'ехаць у адпачынак...

**«Людзі, ужо звязаныя шлюбам, то-бок рашэннем, што сумеснае жыццё будзе доўгае, шукаюць і знаходзяць у сабе сілы, каб навучыцца быць разам, навучыцца трываць недахопы».**

**Д. Т.** — Мора і сонца для мяне проста неабходныя. Стасік шмат гадоў пражыў у Адэсе, і таму кожны год мы адпраўляемся туды. Ездзем недзе на месяц, здымаем лецішча. Такі цудоўны адпачынак — мора, садавіна, сустрэчы з роднымі і сябрамі. Для нас гэта месяца аднаўлення сіл. Былі ў нас вылазкі на папулярныя курорты. Так, там усё ўключана, можа, гэта і нядрэнна, але хочацца паспрабаваць якую-небудзь мясцовую экзотыку, а не хадзіць тры разы на дзень у адзін і той жа рэстаран. Мы, дарэчы, ніколі не ездзілі ў адпачынак толькі ўдваіх. Пакуль жылі ў Адэсе, не прыходзіла ў галаву некуды ехаць. А потым — заўсёды з дзеткамі. Было так, што Стас ішоў з Жэнечкай на дыскатэку, а я з Міронам у калясцы гуляла па беразе мора. А потым раптам наша старэйшая дачка адпускае нас з татам удваіх пагуляць, сама прыглядае за брацікам.

***— Хутка ўжо чвэрць стагоддзя, як вы разам. Адзін з вашых калег сказаў, маўляў, Трыфанавы як маладажоны: усё яшчэ глядзяць адно на аднаго закаханымі вачыма. Як удаецца захаваць свежасць пачуццяў?***

**Д. Т.** — Нашай сям'і ў кастрычніку споўніцца 25 гадоў! У нас не ўзнікаюць сітуацыі, каб мы былі ў канфлікце. Наогул не ўяўляю, як можна ў канфлікце, у канфрантацыі жыць. Наш шлюб заснаваны на ўзаемным інтарэсе, узаемнай павазе, на глыбокім сваяцтве нашых душ, светапогляду і любові. Мы людзі адной фармацыі, мы раназнаёміліся і фактычна разам сфарміраваліся. Мы стараемся адно аднаго падтрымліваць, дапамагаць, таму што мы дарагія адно аднаму, і гэта выдана.

**С. Т.** — У нас адны інтарэсы, мы займаемся адной вельмі прыгожай, светлай справай. Мы з жонкай глядзім у адным напрамку. Нам ніколі не бывае сумна адно з адным. Мы вельмі блізкія людзі. Нам проста добра, калі мы разам. У гэтым мы лішні раз пераканаліся на каранціне. Нельга сказаць, што ён быў вельмі жорсткі, мы маглі некуды выйсці, тым не менш заўсёды былі разам дома. І мы выдатна правялі гэты час. Вядома, ужо хочацца працаваць і спяваць, але гэта не значыць, што мы стаміліся адно ад аднаго ад дзяцей.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н.М. извещает о проведении 24 июня 2020 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 60 % (лоты №№ 1, 2, 4, 10–13) и на 55 % (лоты №№ 5–7) в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Земельный участок под объект продажи **(лоты №№ 11, 12)** будет выделен согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). Затраты за формирование землеустроительного дела, оформления и регистрации земельного участка возмещается за счет победителя аукционных торгов. **4.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-181** общей площадью **58,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **КПП. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-8627** общей площадью **1 226,7 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **помещение здания конторы. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-1. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-9721** общей площадью **2 087,5 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **производственный корпус № 2254. Капитальное строение с инв. № 311/С-30617** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **хозфекальная канализация. Капитальное строение с инв. № 311/С-30619** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **водопровод. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100003002034** общей площадью **0,8513 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания конторы и производственного корпуса инв. № 2254, здания КПП. Автомашина МАЗ 6422а8, инв. № 10300, рег. знак АЕ 0559-3. Полуприцеп МАЗ 938660 044, инв. № 10511, рег. знак А 3205 А-3. Полуприцеп МАЗ 938662 041, инв. № 10512, рег. знак 0474 АА-3 | **207 292,00** | 10 364,60 | 20 729,20 |
| 2 | **Автобус ПАЗ 32053**, инв. № 1-762, рег. знак **АВ 2384-3. Автомобиль ГАЗ 32213**, инв. № 977, рег. знак **АЕ 0557-3**. **Автомобиль МАЗ 543302 220**, инв. № 1-765, рег. знак **АВ 2697-3**. **Микроавтобус ГАЗ 32213**, инв. № 990, рег. знак **AI 0608-3**. **Полуприцеп МАЗ 938020-012**, 2007 года выпуска, регистрационный знак **А 2211 А-3**, идентификационный номер (номер кузова) Y3M93802060000603 | **5 680,00** | 284,00 | 568,00 |
| 4 | **Трактор ДТ-75 ДЕРС-2с**, инв. № 1-761, **рег. знак ЕА-3 7299**. **Местонахождение:** г. Ветка, ул. Батракова, 46 | **1 960,00** | 98,00 | 196,00 |
| 5 | **Кран козловой**, инв. № 273. **Местонахождение:** г. Ветка, ул. Батракова, 46 | **1 890,00** | 94,50 | 189,00 |
| 6 | **Кран козловой ТКК-5**, инв. № 1-132л. **Местонахождение:** г. Добруш, пер. Крылова, 4 | **1 485,00** | 74,25 | 148,50 |
| 7 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28436** общей площадью **526,6 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж.** Уборная (туалет возле гаражей), инв. № 1-797. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320850100004000138** общей площадью **0,2966 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова М.Г., 46 (У-4). **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания гаража | **10 687,50** | 534,38 | 1 068,75 |
| 10 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28437** общей площадью **734,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **склад.** Туалет возле склада (инв. № 1-798). Благоустройство внутридворовое (инв. № 1-355), в т. ч.: асфальтобетонное покрытие: **площадка № 3 – 5625,0 кв. м. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320850100004000141** общей площадью **0,6499 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова М.Г., 46 (У-7). **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания склада | **56 200,00** | 2 810,00 | 5 620,00 |
| 11 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28435** общей площадью **195,8 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **здание РБУ. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320850100004000077** общей площадью **1,0254 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, д. 46 (У-9). **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания полигона ЖБИ, здания РБУ | **16 080,00** | 804,00 | 1 608,00 |
| 12 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28430** общей площадью **820,1 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **полигон ЖБИ (эстакада). Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320850100004000077** общей площадью **1,0254 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, д. 46 (У-9). **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания полигона ЖБИ, здания РБУ | **5 560,00** | 278,00 | 556,00 |
| 13 | **Асфальтобетонное покрытие 609,0 кв. м** (инв. № 7227), расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Малайчука, 12, в т. ч.: асфальтобетонное покрытие – участок № 1 – **409,0 кв. м** | **1 080,00** | 54,00 | 108,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию – Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости – Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 июня 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 22 июня 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

| Шифр и наименование | План приема | |
|---|---|---|
| | дневная форма | соискательство |
| **05.00.00 Технические науки** | – | – |
| 05.18.01 Технология обработки, хранения и переработки злаковых, бобовых культур, крупяных продуктов, плодоовощной продукции и виноградарства | 1 | 1 |
| 05.18.12 Процессы и аппараты пищевых производств | – | – |

**Сверх плана приема для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета**

**ПРОВОДИТСЯ ПРИЕМ НА ПЛАТНОЙ ОСНОВЕ**
**на все специальности аспирантуры и докторантуры**

Прием документов
**с 1 по 30 сентября 2020 года**

Справки по тел.:
(0222) **64-79-14,** (0222) **64-98-06**

УНП 700036606

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПЕРВЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА

Дата, время, место проведения торгов: **20.07.2020, 11.00, г. Борисов, ул. Толстикова, 2.**

Начальная цена предмета торгов: **549 000,00 руб.** Сумма шага аукциона: **27 450,00 руб.**

Сведения о предмете торгов

## Изолированное помещение с инв. № 610/ D-65100 (21a) (столовая).

Претенденты могут ознакомиться с предметом торгов с 11.00 до 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Толстикова, 2 согласовав время с продавцом.

Сведения о продавце:

**ПРУП «Борисовский хрустальный завод им. Ф.Э. Дзержинского»**, **тел. +375447612337.**

Сведения об организаторе торгов:

**ООО «Консалтингово-аудиторский центр МАиС», г. Минск, ул. Мясникова, 39, комн. 331, тел. +375291070012.**

Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка: **претенденты вносят задаток в размере 27450,00 руб. на р/с ПРУП «Борисовский хрустальный завод им. Ф.Э. Дзержинского» № BY14BAPB30123193800100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 600012031.**

Дата, время, место начала приема заявлений – **15.06.2020, 9.00, г. Борисов, ул. Толстикова, 2.**

Дата, время окончания приема заявлений – 17.07.2020 в 16.00.

Срок возможного отказа от проведения торгов – не менее чем за пять дней до даты их проведения.

Победитель торгов возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов в размере, установленном сметой расходов на проведение аукциона.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов заявление с приложением необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол.

В случае признания аукциона несостоявшимся предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, либо единственному участнику, явившемуся для участия в них, при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Договор купли-продажи предмета торгов подписывается с победителем аукциона в срок не позднее 30 дней от даты подписания протокола о результатах аукциона.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет продавца;
- копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;
- доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица;
- легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком;
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 23.06.2020 повторного открытого аукциона

Лот № 1: **изолированное помещение с инв. № 700/D-148808 – помещение № 3** площадью 469,5 кв. м, с входящим в его состав асфальтобетонным покрытием двора площадью 1011,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гомельское шоссе, 5/3-3, на земельном участке с кадастровым номером 740100000007004955 (отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен).

***Начальная цена продажи: 70 600,00 белорусского рубля с учетом НДС***
***Сумма задатка: 7 060,00 бел. рубля***

**Аукцион состоится 23 июня 2020 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок (подаются лично) и внесения задатка: **22 июня 2020 года до 15.00.** Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для перечисления задатка:**
Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 11.12.19 и 03.03.2020

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии с выдаваемым в день проведения аукциона счетом-фактурой. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

**Организатор аукциона**: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222 72-41-14, +37529 624-26-25**

## ОАО «МНИПИ»

**10 июля 2020 г. в 14.30**

**ПРОВОДИТ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**Повестка дня**

1. О внесении изменений в Устав ОАО «МНИПИ».

Собрание состоится в ОАО «МНИПИ» по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 73.

Регистрация акционеров 10.07.2020 г. с 13.30 в техкабинете ОАО «МНИПИ». При себе иметь документ, удостоверяющий личность. С материалами по вопросу повестки дня можно ознакомиться по месту нахождения Общества, телефон 270 08 00.

УНП 100039847

**Иностранное общество с ограниченной ответственностью**

## «Дана Астра»

**информирует о принятии общим собранием участников ИООО «Дана Астра» решения о досрочном погашении части облигаций пятого выпуска и формировании реестра владельцев ценных бумаг**

(протокол внеочередного общего собрания участников ИООО «Дана Астра» от 22.05.2020 г. № 22-05/2020).

Жилищные облигации пятого выпуска зарегистрированы в Государственном реестре ценных бумаг 29.11.2017 за № 5-200-02-3202.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг с целью их досрочного погашения – 19.06.2020 г.

Дата начала досрочного погашения жилищных облигаций пятого выпуска – 26.06.2020 г.

УНП 191295361

**В связи с утерей считать недействительными** страховые свидетельства филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВВ № 8110324, 8085393, 4923897, 4923899–4923900, серии НА № 2940576, 0943970, серии КР № 0059005-0059006; по договорам страхования, заключаемым с физическим лицом (Форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (Форма РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серия БК № 0356715; по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 1240651, 1072639, 1274167; страховой полис по добровольному страхованию наземных транспортных средств юридических лиц формы 2РП серия БТ № 0034918; по добровольному страхованию транспортных средств граждан формы 2РН серии БГ № 0019177.

УНП 100706519

## Информация о проведении 15 июля 2020 г. 94-го открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в Солигорском районе

| № лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| Предмет аукциона | право заключения договора аренды земельного участка | | | | |
| Адрес земельного участка | Солигорский р-н, Чижевичский с/с, п. Хвалево, ул. Центральная, 12А | Солигорский р-н, Зажевчский с/с, аг. Зажевичи, ул. Кальск, 2 | Солигорский р-н, Зажевичский с/с, аг. Зажевичи, ул. Кальск, 3 | Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Листопадовичи, ул. Зеленая, 1 | Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Листопадовичи, ул. Луговая, 30 |
| Кадастровый номер | 625085411601000118 | 625081701601000891 | 625081701601000892 | 625086200601000484 | 625076200601000367 |
| Площадь, га | 0,1353 | 0,0993 | 0,0993 | 0,1727 | 0,2500 |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома) | | | | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) |
| Начальная цена продажи, руб. | 1 083,38 | 346,31 | 346,31 | 592,15 | 857,19 |
| Сумма задатка, руб. | 216,00 | 69,00 | 69,00 | 118,00 | 171,00 |
| Срок аренды земельного участка | 30 лет | 50 лет | | 50 лет | |
| Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | 2 585,25 | 1 803,64 | 1 750,71 | 2 744,08 | 1 890,11 |
| | + затраты на объявление в СМИ | | | | |

**Организатор аукциона: Солигорский районный исполнительный комитет, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.**
**Контактные телефоны: 8 (0174) 23 73 86, 23 73 24.**

**Аукцион состоится в 15.00 15 июля 2020 г. по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний.**

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (http://gki.gov.by/ru/auction/), Минского областного исполнительного комитета – www.minsk-region.gov.by (Главная/Экономика и финансы/Земельные участки), Солигорского районного исполнительного комитета – www.soligorsk.gov.by (Главная/Экономика и бизнес/Инвестиционный атлас/Аукционы).

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Трест Белтрансстрой»** (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8, тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТ-КОНСАЛТ».

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **26 июня 2020 г.** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Здание растворо-бетонного узла 350/С-110912, общ. пл. 384,0 кв. м, сооружение специализированное железнодорожного транспорта (подъездной железнодорожный путь) 350/С-99863, здание склада цемента 350/С-110908, общ. пл. 276,0 кв. м | 885 276,00 |
| 2 | Здание пилорамы 350/С-110903, общ. пл. 466,0 кв. м | 91 476,00 |
| 3 | Здание склада 350/С-110907, общ. пл. 260,0 кв. м, здание многофункциональное (арматурный цех) 350/С-99150, общ. пл. 2 545,3 кв. м, сооружение специализированное водохозяйственного назначения (канализационно-насосная станция) общ. пл. 35,4 кв. м, 350/С-46923, сооружение специализированное водохозяйственного назначения (производственная водопроводная сеть) от ПГ-1 до зданий на территории ОАО «Трест Белтрансстрой» ф-л СМП № 716 с инв. № 350/С-165339, сооружение специализированное водохозяйственного назначения (водопроводная сеть) от ВК-1 до здания РБУ и здания котельной на территории ОАО «Трест Белтрансстрой» ф-л СМП № 716 с инв. № 350/С-165340, сооружение специализированное водохозяйственного назначения (канализационная сеть) от КК1 до КК5 с инв. № 350/С-165341, сооружение специализированное водохозяйственного назначения (канализационная сеть) от КК1 до КК2 с инв. № 350/С-165342 | 1 068 012,00 |
| **Расположенные по адресу: г. Гомель, ул. Шоссейная, д. 9** | | |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 12.06.2020 г. с 09.00 по 25.06.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о раннее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 21.03.2020 г.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский вычислительный центр строителей» (продавец) извещает о проведении 14 июля 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-71091 площадью 29,4 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **кирпичный гараж № 5. Год постройки – 1977. Адрес: г. Гомель, ул. Банная аллея, ГК-29, гараж №5.** **Капитальное строение с инв. № 350/С-71094 площадью 23,6 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **кирпичный гараж № 6 (с ямой). Год постройки – 1977. Адрес: г. Гомель, ул. Банная аллея, ГК-29, гараж № 6. Информация о земельном участке:** имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером **340100000005000611** площадью **0,3398 га** – для содержания и обслуживания гаражей индивидуального транспорта **(право постоянного пользования:** гаражно-строительный потребительский кооператив № 29 Советского района г. Гомеля). Местонахождение: г. Гомель, ул. Банная | **8 640,00** | 864,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский вычислительный центр строителей», г. Гомель, ул. Барыкина, 230. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (029) 398-59-53. Директор ОАО «Гомельский вычислительный центр строителей» – Бондарчук Артем Валерьевич. **Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** **1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельский вычислительный центр строителей»):** УНП 400010845, р/с BY79 BPSB 3012 1119 1301 5933 0000, БИК банка BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк» РД № 300 по Гомельской области (г. Гомель, ул. Крестьянская, 29а), назначение платежа – задаток за участие в аукционе за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 июня 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 июля 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты проведения аукциона; при продаже предмета торгов на аукционе.

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в установленном порядке в соответствии с подписанным в день проведения торгов соответствующим протоколом между продавцом предмета торгов и победителем торгов (единственным участником торгов) заключается договор купли-продажи предмета торгов. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

Сумесны праект Полаччыны і газеты «Звязда»

«Урочышча Пяскі»

# ШЛЯХ СМЕРЦІ КАНЧАЕЦЦА ТУТ

## Мемарыял «Урочышча «Пяскі» ў Полацку адкрыецца 22 чэрвеня

**«...Тыя, хто выкарыстоўваўся на работах, атрымлівалі ў дзень па 200 грамаў хлеба, 13 грамаў мяса, 15 грамаў тлушчаў і 20 грамаў цукру... Імперскае міністэрства забеспячэння рэкамендавала ў якасці хлеба выкарыстоўваць своеасаблівую сумесь: 50 % жытняга вотруб'я, 20 % макухі цукровых буракоў, 20 % цэлюлознай мукі і 10 % мукі, вырабленай з саломы ці лісця» (з кнігі «Урочышча Пяскі — тэрыторыя смерці»).**

На месцы масавага пахавання часоў Вялікай Айчыннай вайны ў Полацку заўсёды цішыня. Цішыня мёртвая — літаральна, — ад якой па спіне бягуць мурашкі. І не таму, што стаіш на велізарным могільніку (калі пошукавікі вызначалі памеры пахавання, чалавечыя косткі былі знойдзены на глыбіні да двух метраў, толькі адна магіла займала плошчу 260 на 100 метраў), а таму што могільнік гэты — прыклад няўяўнай жорсткасці, бесчалавечнасці і зверства.

У 1941—1944 гадах на ўскраіне Полацка размяшчаўся нямецкі перасыльны лагер для савецкіх ваеннапалонных «Дулаг-125». Смяротнасць у лагеры даходзіла да двухсот чалавек у дзень. Усіх хавалі на былым стрэльбішчы. Траншэі з аднаго боку толькі яшчэ капаліся, а з другога — у іх ужо скідаліся трупы, якія прысыпаліся зямлёй.

Згодна з актам ад 7 мая 1945 года па ўстанаўленні і расследаванні фактаў злачынстваў і зверстваў, учыненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх саўдзельнікамі ў перыяд часовай акупацыі Полацка з 15 ліпеня 1941 года да 4 ліпеня 1944 года, за час існавання лагера ў Полацку ў ім было знішчана больш за 40 тысяч ваеннапалонных. Усяго на гэтай зямлі знайшлі апошні прытулак больш за 150 тысяч ахвяр фашызму. Толькі гэты прытулак не стаў спакойным...

Яшчэ колькі гадоў таму моцныя дажджы вымывалі з зямлі чалавечыя косткі, вецер здзімаў тонкі слой пяску з парэшткаў загінулых. Мясцовыя жыхары пасвілі непадалёк скаціну, малыя гулялі ў футбол. У другой палове XX стагоддзя пытанне аб увекавечванні памяці ахвяр нямецкага перасыльнага лагера для савецкіх ваеннапалонных «Дулаг-125» палачане ўзнімалі неаднаразова. У 2010-м — у год 65-годдзя Перамогі — было прынята адпаведнае рашэнне. Да праекта па стварэнні мемарыяла далучылася і «Звязда».

Сёння ў мемарыяле ёсць капліца, Сцяна памяці з прозвішчамі загінулых, якія ўдалося вызначыць, з сімваламі праваслаўя, каталіцтва, іудаізму і ісламу. Зроблены ўваход у выглядзе крыжа. Ёсць і помнік, прысвечаны падзеям вайны 1812 года (у раёне мемарыяла ішлі бітвы). І сёлета нарэшце мы можам належным чынам успомніць тых, хто назаўсёды застаўся ляжаць у полацкай зямлі.

### З чаго пачынаецца патрыятызм

**Старшыня праўлення Беларускага фонду міру Максім МІСЬКО** нагадаў, што пасля прыняцця рашэння аб будаўніцтве мемарыяльнага комплекса памяці ахвяр фашызму «Урочышча «Пяскі» Фонд міру адкрыў дабрачынны рахунак і стаў збіраць добраахвотныя ахвяраванні на будаўніцтва мемарыяла.

«Асноўную фінансавую нагрузку ўзяла на сябе дзяржава, але і Фонд міру здолеў сабраць дастаткова вялікую колькасць сродкаў з усёй краіны. Прычым мы звярталіся ва ўсе магчымыя міністэрствы і ведамствы. І мала было тых, хто адмаўляў. Па магчымасці: нехта больш пералічваў, нехта менш», — расказаў Максім Місько.

Асабліва важкай стала дапамога Міністэрства абароны. Андрэй Раўкоў, у той час міністр абароны, прапанаваў усім часцям правесці афіцэрскія сходы. На іх людзі ў пагонах прынялі рашэнне дапамагчы захаваць памяць пра воінаў Вялікай Айчыннай. Удзельнічалі ў стварэнні мемарыяла і кадэты з суворавцамі.

Актыўна падтрымалі заклік кіраўнікі асноўных канфесій. «Усе вельмі душэўна адгукаліся на гэты заклік і з разуменнем дапамагалі. Атрымалася зліццё актыўнасці дзяржавы і грамадскай арганізацыі. Калі такія буйныя праекты робяцца і не ўсё перакладаецца на плечы дзяржавы, а ўключаецца і бізнес, і грамадства, такія праекты паспяхова завяршаюцца», — упэўнены старшыня праўлення Беларускага фонда міру.

Сапраўды, будаўніцтва, хоць і са спазненнем, завершана. Але гісторыя полацкага мемарыяла толькі пачынаецца. Большая частка Сцяны памяці яшчэ не запоўнена прозвішчамі. Будуць працягвацца пошукавыя работы, каб аднавіць імёны загінулых.

«На наш погляд, гэта ўжо задача маладога пакалення, каб яны паглыбляліся ў гісторыю, каб захоўвалася памяць. А яна будзе захоўвацца, калі нашы дзеці будуць нешта рабіць практычна: адшукаў гузік — а там жа прозвішча, а гэты ж чалавек загінуў... Калі пройме, калі камяк у горле стане, тады чалавек зразумее слова «патрыятызм», — разважае Максім Місько.

Цяпер імёны загінулых аднаўляюцца ў прамым сэнсе па літары. Больш за трыццаць новых прозвішчаў ужо чакаюць нанясення на сцяну, паведаміла **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі 5-га і 6-га скліканняў Наталля ГУЙВІК.**

Для яе 22 чэрвеня стала асаблівa доўгачаканым днём. Дзесяць гадоў таму, калі была старшынёй мясцовага Савета дэпутатаў, Наталля Гуйвік звярнулася з заклікам годна пахаваць ахвяр фашызму, якія знайшлі апошні прытулак ва ўрочышчы «Пяскі», чые рэшткі разносіліся вятрамі і вымываліся дажджом, а душы не мелі спакою. Член праўлення Беларускага фонда міру і куратар будаўніцтва да дробязяў памятае сесію Савета, на якой усе 32 дэпутаты аднагалосна, без усялякіх сумненняў падтрымалі пытанне, унесенае полацкім аддзяленнем Фонда.

«Ніводная добрая справа не робіцца лёгка. Мемарыял будаваўся ўсім светам. Нарэшце мы належным чынам пахавалі ахвяр фашызму. У першую чаргу гэта было зроблена нават не для нас, а ў імя памяці і ўдзячнасці за тое, што мы жывём, у імя нашых дзяцей і ўнукаў — каб яны памяталі», — звярнула ўвагу куратар будаўніцтва.

Яна перакананая: пакуль жывая памяць пра тыя жахлівыя дні, у нас ёсць будучыня.

«Мы даказалі, што мы супольна — гэта велізарная моц. Калі б не адгукнуліся палачане, не падтрымалі ўсе грамадзяне Беларусі, прадпрыемствы, калі б нас не пачулі пры складанні Дзяржпраграмы па ўвекавечванні загінулых пры абароне Айчыны і захаванні памяці пра ахвяр вайны... Мы стукаліся — нам адчынялі, і гэта здорава», — нагадала Наталля Гуйвік.

Увекавечыць памяць загінулых — наш святы абавязак, упэўнены **старшыня Полацкага райвыканкама Ігар МАРКОВІЧ.**

«Ужо больш за 75 гадоў мы жывём мірна. Але пра вайну не забысь. Мы шмат гаворым пра мужнасць і гераізм ветэранаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — кожны з іх наблізіў Перамогу на фронце, у партызанскіх атрадах, у тыле. Мы шануем подзвіг пакалення пераможцаў. Але не маем права забываць і пра тых, хто стаў ахвярай вайны. Ваеннапалонныя, мірныя жыхары... Колькі загінула? І што мы ведаем пра іх?.. Полацкая зямля тоіць нямала сумных старонак ваеннага ліхалецця. Адна з іх — урочышча «Пяскі». Тое, што стала вядома, узрушыла да глыбіні душы», — звярнуўся да землякоў кіраўнік раёна.

Сёння Полаччына актыўна рыхтуецца да фінальных мерапрыемстваў па мемарыялізацыі гэтага месца. Цалкам завершаны мемарыял плануецца адкрыць 22 чэрвеня, у дзень памяці і смутку. У Полацкім райвыканкаме створана рабочая група па падрыхтоўцы і правядзенні ўрачыстасці, абмеркаваныя ключавыя моманты, каб за астатні час завяршыць будаўнічыя работы і годна адкрыць мемарыял.

* * *

«Звязда» далучаецца да падзяк усім неабыякавым беларусам за дапамогу ў стварэнні мемарыяла «Урочышча «Пяскі». Запрашаем 22 чэрвеня ў Полацк на ўрачыстае завяршэнне нашай агульнай справы.

**Варвара МАРОЗАВА.**


## ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «ЛЕТА Ў РАДАСЦЬ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Лета ў радасць са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі з 15 чэрвеня 2020 года да 30 верасня 2020 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2020 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Лета ў радасць са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Масажор ручны Bradex KZ 0306 (далей — суперпрыз) | 1 | 119,21 | 119,21 |
| 2 | Танометр A&D UA-604 (далей — прыз) | 7 | 57,00 | 399,00 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Лета ў радасць са «Звяздой» складае: 518,21 (Пяцьсот васямнаццаць) рубля дваццаць адна капейка.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Лета ў радасць са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2020 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2020 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 15 чэрвеня да 14 ліпеня 2020 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 15 чэрвеня да 14 ліпеня 2020 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 16 ліпеня 2020 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні «Лета ў радасць са «Звяздой» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Дашкевіч Юлія Андрэеўна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Корбут Віктар Эдуардавіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 17 ліпеня 2020 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 25 ліпеня 2020 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 25 ліпеня 2020 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2020 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2020 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2020 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 верасня 2020 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах: (017) 263 66 73, 287 17 40, для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 верасня 2020 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Лета ў радасць са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 263 66 73, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3800 ад 08.06.2020 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

У самаізаляцыі

# Black Lives Matter!

## Глядзім фільм, які тлумачыць, чаму ў ЗША сёння важныя менавіта жыцці чорных

**Працяглыя масавыя хваляванні ў ЗША, справакаваныя смерцю афраамерыканца Джорджа Флойда, сталі галоўнай навіной апошняга часу. Дзеянні паліцэйскіх не ўпершыню абарочваюцца трагедыяй для прадстаўнікоў чорнага насельніцтва Злучаных Штатаў і не ўпершыню выклікаюць рэзананс і пратэсты, але мы з'яўляемся сведкамі гневу насамрэч уражальных маштабаў.**




Каб зразумець, чаму смерць Флойда ўрэшце выклікала такую рэакцыю і чаму на выраз Black Lives Matter, то-бок «Жыцці чорных важныя», сёння некарэктна адказваць All Lives Matter, што значыць «Усе жыцці важныя», можна паглядзець дакументальную карціну «Трынаццатая» рэжысёркі Авы ДзюВерней.

Фільм 2016 года — ён быў намінаваны на прэмію «Оскар» — утрымлівае ў сабе кадры несправядлівых забойстваў паліцэйскімі чарнаскурых, напрыклад, падчас спынення за разбіты габарытнік. Прыводзіць ён і запіс 2014-га, на якім памірае Эрык Гарнер, таксама ад задушлівага прыёму праваахоўнікаў і таксама, як у выпадку з Флойдам, са словамі «Я не магу дыхаць».

Але ў «Трынаццатай» гэтыя прыклады даюцца напаследак, як вынік ці вяршыня айсберга — галоўным чынам карціна Авы ДзюВерней ланцужком маналогаў, дзясяткамі галасоў, дакументальнымі кадрамі, архівамі тэлебачання, уражальнай статыстыкай паказвае, што адмененае ў 1865 годзе рабства не знікла, а толькі прыняло іншую форму. У сваёй рабоце рэжысёрка прадстаўляе грунтоўнае даследаванне, дзе яна бярэ самую што ні ёсць шырокую перспектыву і паказвае, наколькі ўсюдыісныя з'явы працініаюць сучаснае грамадства Злучаных Штатаў і праяўляюцца ў, можна сказаць, непазбежных смерцях.

«Я ўвесь час чую: «І як толькі людзі маглі мірыцца з рабствам, як яны маглі цярпець такое становішча, як яны маглі адпраўляцца глядзець суды Лінча і браць у іх удзел, як яны маглі знаходзіць разумнай сегрэгацыю? Гэта немажліва, калі б мне давялося жыць у такі час, я з гэтым мірыцца не стаў бы». Але паглядзім праўдзе ў вочы — у такі час мы і жывём», — кажа адзін са спікераў «Трынаццатай» і, уласна, акрэслівае сутнасць фільма.

Карціна названа ў гонар адпаведнай папраўкі да Канстытуцыі ЗША, якая ў 1865 годзе ў выніку Грамадзянскай вайны паміж Поўначчу і Поўднем забараніла рабства і прымусовую працу. З адной, праўда, агаворкай — яна не распаўсюджваецца на асуджаных за злачынствы, іншымі словамі, свабодны ўсе апроч зняволеных.

Стужка з самага моманту адмены рабства паслядоўна сочыць за тым, як лазейка ў трынаццатай папраўцы свядома выкарыстоўвалася кіраўніцтвам Злучаных Штатаў і як цярпелі ад яе менавіта афраамерыканцы. Як адразу пасля адмены рабства на Поўдні падскочыла колькасць зняволеных, бо трэба было адбудоўваць эканоміку. Як Рычард Ніксан распачаў кампанію па барацьбе з наркотыкамі, падчас якой сотні тысяч людзей селі ў турму проста за наяўнасць пры сабе марыхуаны. Вядома, так лёгка за краты траплялі менавіта чорныя. Як на насельніцтва чорных раёнаў быццам «накінулася каса» падчас праўлення Рэйгана. І так далей. У выніку сярод зняволеных у сучасных амерыканскіх турмах — сорак працэнтаў чарнаскурых мужчын, прытым што яны складаюць толькі шэсць з паловай працэнтаў ад насельніцтва Злучаных Штатаў. Гэтыя факты ў суправаджэнні мноства дэталяў і дапаўненняў растлумачаць, што тут маецца на ўвазе пад трансфармаваным рабствам.

«Трынаццатая» з яе няхітрай, лаканічнай, сціплай формай, але адначасова змястоўным начыненнем расказвае даволі вялікія гісторыі — пра ўздел у расісцкіх настроях масавага мастацтва, у прыватнасці фільма «Нецярпімасць» Дэвіда Грыфіта, пра палітычныя гульні і карыслівія матывы буйных карпарацый. Па фактуры гэта быццам выбух — усё, што вы ўбачыце, належыць цывілізаванаму свету, і лагічнае пры такім відовішчы пачуццё дысанансу адразу робіць зразумелым, чаму выраз All Lives Matter — прыкмета не справядлівага погляду на свет, а расізму.

Дарэчы, што да відэа смерці Джорджа Флойда — кіно ў гэтай гісторыі зноў становіцца прадказальнікам. Рэжысёр Спайк Лі ў адказ на апошнія падзеі апублікаваў у сваім «Твітэры» відэа, у якім паралельна змантаіраваў запісы смерцяў Эрыка Гарнера і Джорджа Флойда і сцэны са свайго ігравога фільма «Рабі як трэба!» 1989 года, дзе адбываецца прыкладна тое ж самае — паліцэйскі так моцна заціскае дубінкай горла чорнага хлопца, што той у выніку перастае дыхаць.

Тым часам у Х'юстане пахавалі Джорджа Флойда. СМІ кажуць — яго смерць зменіць свет. «Трынаццатая» кажа, што зменены свет надта дорага каштуе.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.41 | 17.03 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.39 | 17.20 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.31 | 17.03 |
| Гомель — | 4.34 | 21.18 | 16.44 |
| Гродна — | 4.55 | 21.55 | 17.00 |
| Брэст — | 5.05 | 21.46 | 16.41 |

## Месяц

*Поўня 5 чэрвеня. Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр. Фядоссі, Івана, Лукі. К. Адэлаіды, Настассі, Розы, Варнавы, Фелікса.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА




Даты Падзеі Людзі

**11 ЧЭРВЕНЯ**

У краіне

**1925** год — нарадзіўся Раман Сямёнавіч Ваткін, беларускі трэнер па спартыўнай гімнастыцы, заслужаны трэнер Беларусі, заслужаны трэнер СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі. У 1956—1976 гадах старшыня федэрацыі гімнастыкі Рэспублікі Беларусь; начальнік каманды гімнастаў Рэспублікі Беларусь, старшы трэнер зборнай каманды Беларусі — пераможцы спартакіяды народаў СССР (1975).

**1945** год — нарадзіўся Віктар Уладзіміравіч Крамарэнка, беларускі архітэктар. Сярод работ: лячэбны корпус санаторыя «Беларусь» у Друскінінкаі (Літва), будынак Магілёўскага тэатра драмы і камедыі імя Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску, кінатэатр «Масква» ў Мінску, архітэктурна-скульптурны комплекс «Мінск — горад-герой», будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і помнік Францыску Скарыне перад ёй. Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.



**1960** год — устаноўлена ганаровае званне «Заслужаны будаўнік Беларускай ССР» (з 13 красавіка 1995-га «Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь»).

**1980** год — народнай артыстцы Беларусі Галіне Макаравай прысвоена званне народнай артысткі СССР.

У свеце

**1850** год — нарадзіўся Аляксандр Аляксеевіч Баброў, рускі хірург, заснавальнік навуковай хірургічнай школы.

**1895** год — нарадзіўся Мікалай Аляксандравіч Булганін, савецкі дзяржаўны, партыйны і ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы. У Вялікую Айчынную вайну член ваенных саветаў шэрагу франтоў, з 1944-га — член Дзяржаўнага камітэта абароны і намеснік наркама абароны. У 1953—1955 гадах міністр абароны СССР, у 1955—1958 гадах старшыня Савета Міністраў СССР.

**1910** год — нарадзіўся Жак-Іў Кусто, французскі акіянограф, пачынальнік падводных даследаванняў і кіназдымак. Стаў стваральнікам воданепранікальных камер і асвятляльных прыбораў, вынайшаў першую падводную тэлевізійную сістэму. Аўтар тэлевізійнага серыяла «Падводная адысея Кусто».

**1930** год — амерыканскі заолаг Уільям Біб і інжынер Оціс Бертан на пабудаванай імі батысферы апусціліся ў марскую глыбіню на 400 метраў. Праз два гады яны дасягнулі глыбіні пагружэння 900 метраў.

Так гаварыў...

**СЕНЕКА МАЛОДШЫ:**
*«Як байка, так і жыццё цэняцца не за даўжыню, а за змест».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Ты чаму такі сумны?
— Не тое слова! Я проста ў жаху.
— Чаму ж?
— Я сустракаў сваю жонку на вакзале, а яна не прыехала. Баюся, што яна дома... яшчэ з учарашняга дня!

**Іду па вуліцы, бачу, бландзінка ў машыну масла даліваe. Афігеў!**

**Падыходжу бліжэй, не, усё нармальна — масла заліваецца ў бачок амывальніка.**

Рабіновіч доўга спрачаецца з жонкай з нейкай нікчэмнай нагоды, потым, змучаны, здаецца і кажа:
— Добра, хай будзе па-твойму.
— Позна, — кажа жонка, — я ўжо перадумала.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1843.
Нумар падпісаны ў 19.30 10 чэрвеня 2020 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12